Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
Proletarier aller Länder, vereinigt euch! Prolетарии всех стран, соединяйтесь! Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І КАЗАЧЫХ САВЕТАЎ І ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ НАРОДНЫХ ДЭПУТАТАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

НЯДЗЕЛЯ
2 жніўня 1931 г.
№ 176 (3265)

I-б. Савецкая Беларусь
Москва, Маховая, 3 Публичная библиотека СССР им. Ленина
отд. обмен. адвін экз.

АБ ВЫДАНЬНІ „ГІСТОРЫІ ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЫ“

Пастанова ЦК УсеКП(б) ад 30 ліпеня 1931 году

Адобрыць ініцыятыву т. А. М. Горкага і прыступіць да выданьня для шырокіх працоўных мас „Гісторыі грамадзянскай вайны“ (1917—1921 г. г.) у 10—15 томаў у выглядзе збораў навукова-гістарычных артыкулаў і літаратурна-мастацкіх твораў

Для рэдагаваньня „Гісторыі грамадзянскай вайны“ стварыць:

1) Галоўную рэдакцыю ў складзе т. т Горкага, Молатава, Варашылава, Кірава, Бубнова, Гамарніка і Сталіна
2) Гістарычную рэдакцыю ў складзе т. т. Пакроўскага, Бубнова, Горкага, Яраслаўскага, Скрыпніка, Гамарніка, Якаўлева Я. А., Ахундава, Сьцецкага, Папова Н. Н. і Эйдэмана
3) Мастацкую рэдакцыю ў складзе т. т. Горкага, Дзям'яна Беднага, Фадзеева, Усевалада Іванова, Ляонава, Мікіценка, Чарота, Кіршона, Эйдэмана, Федзіна, Панферава і М. Кальцова

ЦК УсеКП(б)

Аб разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі

УСІМ ПАРТЫЙНЫМ, САВЕЦКІМ, ГАСПАДАРЧЫМ, ЗЯМЕЛЬНЫМ І КАЛГАСНЫМ АРГАНІЗАЦЫЯМ

Цэнтральны камітэт УсеКП(б) і Савет народных камісараў СССР лічаць работу па стварэньні і ўзмацненьні сацыялістычнага сэктару ў галіне жывёлагадоўлі—саўгасаў і калгасных тавар ных фэрм—цэнтральнай задачай бліжэйшага часу ў галіне сельскай гаспадаркі. 1931 і 1932 гады павінны быць гадамі такога-ж рашучага перадому ў галіне разгортваньня жывёлагадоўлі якімі былі 1929 і 1930 гады ў справе арганізацыі сацыялістычнай зярнёвай гаспадаркі.

На гледзячы на кароткі тэрмін свайго існаваньня, аграмаджаная жывёлагадоўля (саўгасы і калгасныя таварныя фэрмы) ужо стварыла значны статак (2 млн. галоў буйнай рагатай жывёлы ў жывёлагадоўчых саўгасах, 745 тысяч кароў у таварных калгасных фэрмах, паўмільёна сьвіней саўгасаў Сьвінаводу, 250 тысяч сьвінаматак у калгасных фэрмах) і заняла значнае месца ў вытворчасьці таварнага масла. (На 1 ліпеня г. г. малочныя таварныя калгасныя фэрмы і жывёлагадоўчыя саўгасы здалі 680 тысяч пудоў масла).

Савет народных камісараў СССР і Цэнтральны камітэт УсеКП(б) зьвяртаюць увагу ўсіх партыйных, савецкіх і калгасных арганізацый на тое, што ў асобе калгасных таварных фэрм і інкубатарных птушкаводных станцый знойдзена форма стварэньня аграмаджанай жывёлагадоўлі і птушкагадоўлі, найбольш адпаведная сучаснай арцельнай стадыі разьвіцьця калгаснай гаспадаркі і побач з саўгасамі найбольш шпарка рашаючая задачу стварэньня буйнай таварнай жывёлагадоўлі. Гэтая форма гаспадаркі дае высокую таварнасьць—каля 70 проц. па малаку і маслу замест 10—20 проц. у адназасобных гаспадарках і замест 10—30 проц. у звычайным аграмаджаным калгасным статку. Гэтая форма гаспадаркі заслугоўвае ўсямернага падтрыманьня з боку ўсіх партыйных і савецкіх органаў. Зьяўляючыся адным з выгаднейшых сельскагаспадарчых галін калгаснай гаспадаркі і разьвіваючыся побач з адназасобным спажывецкай жывёлагадоўчай гаспадаркай калгаснікаў і аграмаджаным статкам у калгасах, калгасныя фэрмы ў далейшым, бясумоўна, станучь важнейшым вытворцам таварнай жывёлагадоўчай прадукцыі для дзяржавы.

Побач са значнымі колькаснымі посьпехамі ў галіне разгортваньня жывёлагадоўчых саўгасаў і таварных фэрм калгасаў, ЦК УсеКП(б) і СНК СССР адзначаюць рэзкае адставаньне якасных паказьнікаў: недастатковае кармленьне і доэнны дагляд за жывёлай і безгаспадарчасьць у радзе жывёлагадоўчых саўгасаў і некаторае адставаньне ў камплектаваньні статку саўгасаў па лініі Саюзмяса,—абставіны, якія тармозяць выкананьне прынятай урадам праграмы будаўніцтва жывёлагадоўчых саўгасаў і таварных калгасных фэрм у 1931 годзе.

Шляхам будаўніцтва саўгасаў і калгасаў партыя вырашыла зярнёвую праблему і ўжо дамаглася рашучых зрухаў у справе разьвіцьця тэхнічных культур (бавоўна, лён, буракі).

Першыя крокі па будаўніцтву сацыялістычнай жывёлагадоўлі (жывёлагадоўчыя саўгасы, калгасныя таварныя малочныя і сьвінагадоўчыя фэрмы і інкубатарна - птушкаводныя станцыі, аграмаджаны статак у калгасах) паказваюць, што і вырашэньне задачы па ўзьнаўленьню жывёлагадоўлі і павялічэньню таварнай жывёлагадоўчай прадукцыі можа быць дасягнута толькі тым-жа выпрабаваным шляхам, г. зн. шляхам стварэньня і ўзмацненьня буйнай аграмаджанай гаспадаркі па жывёлагадоўлі.

У 1931 годзе павінны быць закладзены цьвёрды фундамант для далейшага шпаркага разьвіцьця сацыялістычнага сэктару жывёлагадоўлі з тым, каб забясьпечыць і ў гэтай галіне, пакуль яшчэ слаба аграмаджанай галіне сельскагаспадарчай вытворчасьці перамогу сапраўды арганізаванай, мэханізаванай заснаванай на апошніх дасягненьнях навукі буйнай сацыялістычнай гаспадаркі.

Адпаведна з гэтым ЦК партыі і СНК СССР пастанаўляюць:

1. Давесьці пагалоўе жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасных таварных фэрм у канцы 1931 г.: па Скатаводу—да 2.800.000 галоў, па Сьвінаводу—1.900.000 галоў, па малочных рэспубліканскіх трэстах—да 260.000 кароў і ў тым ліку па Малакатрэсту РСФСР—130.000 кароў, па Маслатрэсту—да 130.000 галоў (з павялічэньнем супроць пляну на 70.000 кароў), па Саюзсахару—да 140.000 кароў (з павялічэньнем супроць пляну на 50.000 кароў) да 40.000 сьвінаматак, па Аўцаводу да 4 800.000 авечак (з павялічэньнем супроць пляну на 800.000 галоў), па Аленяводчым трэсьце РСФСР—да 200.000 галоў, па Птушкатрэстах — да 3.000.000 галоў птушкі, па Малакакагас цэнтру—да 1.500.000 дойных кароў, па Сьвінаводкалгасцэнтру - да 700.000 сьвінаматак, па Інкубатарптушкацэнтру—да 10.000.000 галоў птушкі.

2. Прапанаваць Наркамснабу СССР перадаць саўгасам і таварным калгасным фэрмам да канца 1931 г.: 1.700.000 галоў буйнай рагатай жывёлы, у тым ліку да 1-X—1.200.000 галоў; цялят і маладняка 2.500.000 галоў, у тым ліку да 1-X—2.100.000; сьвінаматак 415.000 галоў, у тым ліку да 1-X—315.000 галоў; авечак да 1-X—2.000.000; птушкі здаць да 1-X: курэй—570.000 галоў, гусей—75.000 аглоў, качак—300.000 галоў, забясьпечыўшы строгае выкананьне паквартальных і месячных плянаў камплектаваньня статку.

3. Прапанаваць Калгасцэнтру напоўніць аграмаджаны статак калгасаў ня менш чымся на 1,5 млн. цялят, 500 тысяч парасят і 1 млн. ягнят у 1931 г. і ня менш чымся на 4 млн. цялят, 3 млн. парасят і 2 млн. ягнят у 1932 г. шляхам пакупкі праўленьнямі калгасаў маладняка ў сваіх членаў, а таксама шляхам аграмаджаньня часткі прыплоду жывёлы калгаснікаў.

4. Абавязаць мясцовыя партыйныя арганізацыі і зямельныя органы аказваць ўсялякую дапамогу камплектаваньню статку калгасных жывёлагадоўчых фэрм шляхам вылучэньня калгасамі для гэтых фэрм некаторай часткі сваёй аграмаджанай жывёлы, а таксама шляхам пакупкі ў сваіх членаў для фармаваньня статку фэрм кароў і сьвіней і ў асаблівасьці цялят і парасят

5. Прапанаваць Наркамснабу СССР праводзіць здачу жывёлы саўгасам і калгасным таварным фэрмам пераважна непасрэдна з пяршачных загатоўчых пунктаў з тым, каб загатаўляемая Саюзмясам жывёла накіроўвалася ў нагульныя гурты і на забой толькі пасьля агляду гэтай жывёлы і адбору годнай для вытворчых мэтаў жывёлы на камплектаваньне саўгасаў і калгасных фэрм у лік пляну. Устанавіць тэрміны для адбору жывёлы з загатоўчых пунктаў Саюзмяса прыёмшчыкамі жывёлагадоўчых саўгасаў ад 5 да 8 дзён.

Прапанаваць Наркамснабу СССР на справе забясьпечыць выкананьне ўстаноўленай законам забароны пасьля мённых кароў і рытворцаў, прыцягваючы вінаватых у парушэньні гэтага закону да самай суровай адказнасьці.

Абавязаць органы НКЗему прымаць перададзеную загатоўчымі базамі Саюзмяса племенную жывёлу для камплектаваньня статку саўгасаў ва ўсіх бяз выключэньня раёнах зьне залежнасьці ад плянаў камплектаваньня данага раёну.

6. Адзначаючы ненормальна вялікі падзёж жывёлы, у асаблівасьці маладняка, у жывёлагадоўчых саўгасах у мінулую зіму, ЦК УсеКП(б) і СНК СССР прапануюць жывёлагадоўчым трэстам, цэнтрам калгасных таварных фэрм, зямельным органам і калгассаюзам прыняць належныя меры да рашучага палепшаньня дагляду за жывёлай і да зьніжэньня процанту адыходу ад рознага роду хвароб і неадкладнага ўтрыманьня жывёлы і дамагчыся ў бліжэйшыя гады рашучага павялічэньня тэмпаў прыросту статка саўгасаў і калгасаў.

7. Зацьвердзіць плян вытворчасьці і здачы жывёлагадоўчым трэстам і цэнтрам калгасных таварных фэрм прадукцыі на 1931 г. у наступных разьмерах:

а) па маслу	34,9 тыс. тон
у тым ліку маслатрэст	3,5 „ „
Скатавод	4,0 „ „
Рэсп. малочныя трэсты	1,0 „ „
Саюзсахар	3,4 „ „
Усяго па саўгасах	11,9 „ „
Таварныя фэрмы Малакакагасцэнтру	23,0 „ „
(у пераводзе на малако	510.000 тон)
б) па мясу	103,6 тыс. тон
у тым ліку Скатавод	48,3 „ „
„ Сьвінавод	18,0 „ „
„ Аўцавод	8,0 „ „
„ Жывёл. рэсп. трэсты і Малсалтрэст	6,0 „ „
„ Саюзсахарвод	18,5 „ „
„ Сьвінакалгасцэнтр	4,8 „ „
в) па воўне:	
Аўцавод	8,0 па догавару
г) па яйках	50,3 тыс. тон скрып.
У тым ліку Птушкатрэсты	5,3 тыс. тон
„ Інкубатарптушкацэнтр	45,0 „ „
д) па малаку:	
Рэсп. малакагаролтр	160,0 „ „
е) па казэіну:	
Маслатрэст	1000,0 тон
ж) па сыру і б ынзе	5,9 тыс. тон
у тым ліку: Маслатрэст	1,0 тыс. тон сыру
„ Аўцавод	1,9 „ „ брынзы

8. Зацьвердзіць плян Наркамснабу СССР па адкорму буйнай рагатай жывёлы і сьвіней на адкідах харчовай прамысловасьці грамадзкага харчаваньня і прытарабных гаспадарак на пэрыяд з 1 кастрычніка 1931 г. па 1 студзеня 1933 г. у колькасьці 500 тыс. галоў буйнай рагатай жывёлы і 2.100 тыс. галоў сьвіней, у тым ліку ў IV кв. 1931 г. буйнай рагатай жывёлы 125 тыс. галоў, сьвіней 451.200 галоў.

9. Адзначаючы вялізарнае значэньне дробнай жывёлагадоўлі (сьвінагадоўля, птушкіцтва, трусагадоўля) у справе забясьпечэньня мясам, ЦК УсеКП(б) і СНК СССР прапануюць усім мясцовым партыйным, зямельным і калгасным арганізацыям зьвярнуць асаблівую ўвагу разьвіцьцю гэтых скарасьпелых відаў жывёлагадоўлі.

Запрапанаваць Сьвінаводкалгасцэнтру адкармідь і здаць дзяржаве ў 1932 годзе ня менш 2 млн. галоў сьвіней: апроч таго запрапанаваць Калгасцэнтру паставіць задачу перад калгасамі, ня маючымі сьвінагадоўчых і птушніцкіх таварных фэрм, арганізаваць у кожным калгасе калектыўнае вырошчваньне і калектыўны продаж дзяржаве: ад 10—50 сьвіней ў адкормленым відзе, у залежнасьці ад магутнасьці калгасу, у раёнах аўцаводзтва ад 10 да 50 авец, у раёнах птушкіцтва ад 100 да 500 галоў птушак і ў раёнах трусагадоўлі ад 100 да 300 трусоў.

Запрапанаваць Цэнтрасаюзу паставіць такую-ж задачу перад сельскімі спажывецкімі таварыствамі.

Даручыць НКснабу СССР сумесна з Наркамземам, Калгасцэнтрам і Цэнтрасаюзам у 2-х дэкадны тэрмін намеціць мерапрыемствы па матар'яльнаму заахвочэньню калгасаў і спажыўтаварыстваў, пасьпяхова выконваючых паказанае заданьне.

10. Для забясьпечэньня выкананьня пляну здачы таварнай прадукцыі жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасных таварных фэрм:

а) абавязаць зямельныя органы ў далейшым значэ больш узмацніць устаноўлены імі нагляд за ходам здачы таварнай прадукцыі саўгасамі і таварнымі фэрмамі, няўхільна прыцягваючы дырэктароў саўгасаў і таварных фэрм, вінаватых у разбазараньні таварнай прадукцыі, да суровай адказнасьці, як за раскраданьне народнай маёмасьці;

в) устанавіць спэцыяльныя прэміі за перавыкананьне пляну здачы прадукцыі пасобнымі саўгасамі і калгаснымі таварнымі фэрмамі як у форме грашовых і натуральных выдач дырэктарам, рабочым і спэцыялістам жывёлагадоўчых саўгасаў, перавыканаўшых плян, так і ў форме прэміраваньня саўгасаў і таварных фэрм у цэлым шляхам водпуску звыш пляну трактароў, машын, а таксама дадатковага водпуску канцэнтраваных кармоў, пляменных вытворнікаў і да т. п.;

в) забясьпечыць у адносінах ўсіх бяз выключэньня спэцыялістаў, вышэйшага адміністрацыйнага пэрсаналу і старэйшых рабочых саўгасаў правядзеньне ўстаноўленай Наркамземам СССР сыстэмы падвышэньня заработнай платы гэтых катэгорый работнікаў саўгасаў у адпаведнасьці з разьмерамі вытворчасьці і здачы таварнай прадукцыі.

11. Абавязаць ЦК нац. кампартый, крайкомы (абкомы), СНК саюзных і аўтаномных рэспублік і крайвыканкомы ўстанавіць рэгулярны нагляд за ходам камплектаваньня стада саўгасаў і калгасных таварных фэрм, а таксама за здачай саўгасамі і калгаснымі таварнымі фэрмамі таварнай прадукцыі і забясьпечыць поўнае і своячасовае выкананьне пляну камплектаваньня стада саўгасаў і таварных калгасных фэрм, выкананьне імі пляну па здачы таварнай прадукцыі.

12. Адзначаючы, што стварэньне трывалай кармовай базы зьяўляецца рашаючай умовай пасьпяховага разгортваньня жывёлагадоўчых саўгасаў і таварных калгасных фэрм, запрапанаваць зямельным органам, калгассаюзам і жывёлагадоўчым трэстам і калгасным цэнтрам поўнасьцю забясьпечыць усё пагалоўе жывёлы жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасных фэрм уласнымі грубымі і сакавітымі кармамі, для чаго ў бягучую ўборачную кампанію правесьці ўборку сена ў саўгасах на плошчы ня менш 11 млн. гектараў і ў калгасах ня менш 30 млн. га і засіласаваць у калгасах і ў саўгасах ня менш 10 млн. тон сілосу.

13. Запрапанаваць НКснабу СССР ад пусьціць з дапяржаўных фуражных рэсурсаў ураджаю 1931 г. Наркамзему СССР для пакрыцьця дэфіцыту ў канцэнтраваных кармох жывёлагадоўчых саўгасаў Наркамзему і калгасных таварных фэрм:

жмыхоў	18 млн. пуд.
вотрубяй	60 „ „
зярнёвых культур	100 „ „
у тым ліку для пакрыцьця дэфіцыту ў канцэнтраваных кармох жывёлагадоўчых саўгасаў НКзему адпусьціць:	
жмыхоў	15 млн. пуд.
вотрубяй	50 „ „
зерняфуражу	93 „ „

Для пакрыцьця дэфіцыту ў канцэнтраваных кармох калгасных таварных фэрм, ня маючых дастатковай колькасьці ўласных канцэнтраваных кармоў, адпусьціць з дзяржаўных рэсурсаў 20 млн. пудоў, у тым ліку:

жмыхоў	3 млн. пуд.
вотрубяй	10 „ „
зерняфуражу	7 „ „

14. Для ўзмацненьня дзяржаўных рэсурсаў канцэнтраваных кармоў прыняць неабходным шырокае разгортваньне пераапрацоўкі на кармы адходаў харчовасмакоўнай прамысловасьці, для чаго прапанаваць у другой палове 1931 г. і ў 1932 г.:

Выпрацаваць

С юзпукру	1,5	млн. цэтн. сухога жому
Саюзрыбе	0,11	„ „ рыбяй мукі
Саюзм су	0,15	„ „ крывяной і мясакостнай мукі
Крахма апатачнаму аб'яднаньню	450,0	тыс. „ кукурузнай мязгі
Саюзспірту	70,0	„ „ сухой барды
Брадзільнаму аб'яднаньню	100,0	„ „ драбіны
„	50,0	„ „ дражджэй

Прызнаць неабходным для забясьпечэньня гэтай праграмы павялічэньне аб'ёму капітальных затрат на адпаведных галінах прамысловасьці НКснабу для ўтылізацыі адкідаў харчовай прамысловасьці на 27 млн. руб. з асігнаваньнем у бягучым 1931 г. 10 млн. руб. Астатнюю суму прадугледзець у плане на першае паўгодзьдзе 1932 г.

15. Поруч з разгортваньнем камбікармовай прамысловасьці ў сыстэме НКснабу СССР стварыць у сыстэме НКзему СССР спэцыяльны трэст «Камбікармоў» для будаўніцтва заводаў і арганізацыі вытворства камбікармоў.

Запрапанаваць НКснабу СССР і НКЗ СССР у дадатак тэрмін прадставіць у Савет Працы і Абароны плян разгортваньня камбікармовай прамысловасьці ў сыстэме НКснабу і НКзему СССР на 2-ю палову 1931 г. і на 1932 год.

Запрапанаваць ВСНГ СССР у месячны тэрмін прыступіць да разгортваньня вырабу абсталяваньня для камбікармовай прамысловасьці і ўтылізацыі адкідаў харчовай і сельскагаспадарчай прамысловасьці.

16. Запрапанаваць ВСНГ СССР устанавіць спэцыяльны нагляд за ходам выкананьня ўстаноўленай праграмы будаўніцтва стандартных сілосных вежаў на заводах лясной прамысловасьці і забясьпечыць снабжэньне прадугледжанага ўрадавым планам сілоснага будаўніцтва неабходным абсталяваньнем і будаўнічымі матар'ялам.

Запрапанаваць НКзему СССР арганізаваць у сыстэме Саюзсельбуду спэцыяльную кантору для кіраваньня будаўніцтвам сілосных пабудоў і для тэхнічнага інструктаваньня будоўлі сілосных пабудаваньняў, якая ажыцьцяўляецца жывёлагадоўчымі трэстамі і калгаснымі гаспадарчым спосабам, выдзяліўшы для гэтай канторы з рэзэрвовага фонду НКзему СССР і млн. рублёў.

17. Фонд канцэнтраваных кармоў, які выдзяляецца згодна з данай пастановай для саўгасаў і калгасных таварных фэрм, запрапанаваць НКснабу ад пусьціць у распараджэньне НКзему СССР, а выдаткаваньне яго весьці па водле плянаў і ўказаньняў НКзему СССР, пагодженых з НКснабам СССР, пры гэтым павінна быць забясьпечана самае строгае захаваньне парадку выдачы канцэнтраваных кармоў калгасным таварным фэрмам у залежнасьці ад здачы імі таварнай прадукцыі, згодна заключэньня кантрактацыйных дагавораў.

Для спрашчэньня і палепшаньня парадку атрыманьня кармоў саўгасам захаваць за ўсіх раёнах сыстэму прыпіскі саўгасаў непасрэдна да элеватараў, млыноў і маслабойных заводаў.

18. Адзначаючы зусім нездавальняючае выкананьне пляну капітальнага будаўніцтва ў жывёлагадоўчых саўгасах, абавязаць крайкомы (абкомы) і ЦК нацкампартый, Саюзсельбуд, жывёлагадоўчыя трэсты забясьпечыць завяршэньне будаўніцтва ў саўгасах, неабходнага для разьмяшчэньня жывёлы, не пазьней 15 лістапада 1931 году. Для гэтага ўстанавіць рэгулярнае, ня менш і разу ў месяц, заслухоўваньне дакладаў аб ходзе будаўніцтва ў крайкомах (абкомах) і райкомах партыі, усклаўшы на аднаго з членаў бюро крайкомаў і райкомаў сыстэматычны нагляд за выкананьнем капітальнага будаўніцтва ў жывёлагадоўчых саўгасах. Запрапанаваць ВСНГ і НКШЗ закончыць завоз будматар'ялаў, асабліва лесаматар'ялаў, адпушчаных жывёлагадоўчым саўгасам на першыя тры кварталы, не пазьней, чым да 1 верасьня гг.

19. Прымаючы пад увагу, што разгортваньне буйнай малочнай гаспадаркі ў гэтым годзе сустракае значныя перашкоды з-за недахвату спэцыяльнага малочнага інвэнтара для тавараспартаваньня малака (флягі, бідоны і гэтак далей), абавязаць ВСНГ СССР і Усекамрамсаюз разгарнуць выраб гэтай пасуды і інвэнтара ў неабходных разьмерах для забясьпечэньня захаваньня і дастаўкі малака на перапрацоўчыя і спажывецкія пункты, скарыстоўваючы для гэтага ў першую чаргу саматужную прамысловасьць.

20. Для забясьпечэньня жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасных таварных фэрм належнымі кадрамі кіруючых работнікаў і спэцыялістаў запрапанаваць жывёлагадоўчым трэстам і Калгасцэнтру СССР:

а) давесьці ў 1932 годзе ў кожным саўгасе лік спэцыялістаў вышэйшай кваліфікацыі да 6—8 чалавек і сярэдняй кваліфікацыі да 15—20 чалавек і ў кожнай калгасной таварнай фэрме да 2-3 спэцыялістаў вышэйшай і сярэдняй кваліфікацыі як шляхам разгортваньня адпаведнай сеткі ВНУ і тэхнікумаў, так і шляхам падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі праз курсавую сетку;

б) арганізаваць у сыстэме жывёлагадоўчых трэстаў і калгасных цэнтраў шырокую сетку кароткатэрміновых курсаў па падрыхтоўцы кваліфікаванай рабочай сілы (старэйшых гуртаправаў, скотнікаў, даярак, чабаноў, сьвінароў, птушнікаў, ветэрынарных фэльчараў і г. д.);

в) абавязаць крайкомы, абкомы і ЦК нацпартый у дзядны тэрмін супольна з краўніцтвамі жывёлагадоўчых трэстаў перагледзець увесь склад упаўнаважных трэстаў і спэцыяльных калгасных цэнтраў, маючых на ўвазе неабходнасьць падбору, які сапраўды ведае і можа забясьпечыць палепшаньне пастаноўкі справы людзей;

г) аддзелу кадраў ЦК УсеКП(б) у месячны тэрмін перадаць НКЗему СССР для ўзмацненьня кадраў жывёлагадоўчых саўгасаў Скатаводу, Сьвінаводу, Аўцаводу, Маслатрэсту неабходную колькасьць работнікаў для замацненьня пасад дырэктароў пачова арганізуемых саўгасаў і ўзмацненьня старых саўгасаў;

д) у адпаведнасьці з тым, што роля мясцовых органаў і іх адказнасьць за выцікі разгортваньня сацыялістычнай жывёлагадоўлі ўсё больш узмацняецца, асабліва ў галіне будаўніцтва, фармаваньня статку і здачы таварнай прадукцыі, прызнаць правільным утварэньне НКЗ СССР пашырэньне правоў аблаcных упаўнаважаных жывёлагадоўчых трэстаў і перадачу im раду апэрацыйных функцый. Адобрыць пастанову НКЗ СССР ад 14-га мая, якая вызначае пашырэньне правоў упаўнаважаных трэстаў.

21. Для забясьпечаньня разгортваньня жывёлагадоўлі ў нацыянальных жывёлагадоўчых раёнах (сярэдн.-азіяцкія рэспублікі, Казакстан, Кіргізія, Бурата-Манголія, Кара - Калпакія, Дагестан, Калмыкія) даручыць НКснабу і КНЗему СССР супольна з урадамі паказаных рэспублік і абласьцей пры ажыцьцяўленьні пляну пасеўкампаніі, пляну мясазагатовак і пры распрацоўцы мерапрыемстваў па асяданьні качавога насельніцтва забясьпечыць правядзеньне мер, стымулюючых разьвіцьцё таварнай жывёлагадоўлі ў гэтых раёнах, як-то:

а) прадугледзець далейшае шырокае разьвіцьцё машынасенакосных станцый у гэтых раёнах з давядзеньнем іх колькасьці ў 1932 г. ня менш чым да 350;

б) разгортваньне падсобных, спажывецкага характару, пасеваў збожжавых культур і гародніны ў раёнах, якія да сучаснага моманту зьяўляюцца выключна жывёлагадоўчымі;

в) узмацненьне забясьпечаньня гэтых раёнах мануфактурай ,абуткам і іншымі таварамі, выробляемымі на месцы са скуры і воўны;

г) пры кантрактацыі жывёлы ў гэтых раёнах прадугледзець забясьпечаньне неабходнага фонду збожжа ў парадку кантрактацыі, аналёгічна таму, як гэта мае месца ў адносінах тэхнічных культур;

д) канчатковую ліквідацыю на працягу бліжэйшых 2-3 год асабліва пагубных для качавой жывёлагадоўлі эпізоцій;

г) узмацненьне мерапрыемстваў па падвышэньні кваліфікацыі рабочых кадраў жывёлагадоўчых саўгасаў (гуртаправы, чабаны і г. д.) фармулюемых з мясцовага насельніцтва шляхам арганізацыі сеткі кароткатэрміновых курсаў і тэхнікумаў у гэтых раёнах.

22. У мэтах стварэньня ўстойлівай сыравінай базы для ўдасканаленых мясных камбінатаў, што будуюцца, ў буйных спажывецкіх цэнтрах і ў асноўных жывёлагадоўчых вытворчых раёнах запрапанаваць НКЗему СССР:

а) забясьпечыць разгортваньне необходнай сеткі жывёлагадоўчых саўгасаў у раёнах будаўніцтва мясакамбінатаў (Ленінградзкая, Маскоўская, Уральская вобласьці, Сібір і інш.);

б) забясьпечыць здачу на мясакамбінаты ў 1933 годзе ня менш 6 млн. галоў сьвіней саўгасамі Сьвінаводу і ня менш 7 млн. галоў калгаснымі сьвінагадоўчымі фэрмамі і ў цэлым 80 проц. патрэбы мясакамбінатаў і ў 1935 г. паступленьне з саўгасаў Сьвінаводу і калгасных сьвінагадоўчых таварных фэрм на тыя-ж камбінаты ня менш 15 млн. галоў сьвіней;

в) забясьпечыць здачу саўгасамі Скатаводу на мясакамбінаты ў 1933 г. ня менш 1 млн. галоў і ў 1935 годзе 1,6 млн. галоў ,што павінна складаць ня менш ½ вытворчай магутнасьці мяса камбінатаў;

г) забясьпечыць паступленьне з саўгасаў Аўцавода на мясакамбінаты ў 1933 г. ня менш 1,8 млн. галоў авец і ў 1935 г. ня менш 3 млн. галоў, што павінна скласьці каля ²/₃ нагрузкі мясакамбінатаў

23. Даручыць СПА не пазьней 1-га гэтага жніўня забясьпечыць адпаведным фінансаваньнем у 3 і 4 кварталах праграмы разгортваньня жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасных таварных фэрм у разьмерах, неабходных для выкананьня ўсёй праграмы, намечанай гэтай пастановай.

24. Адобрыць пастанову НКЗ СССР і Калгасцэнтру аб павялічэньні, у адпаведнасьці з данай пастановай, разьмераў крэдытаваньня Малкалгасцэнтру да 165 млн. руб., Сьвінаводкалгасцэнтру да 55 млн. руб., Інкубатараптушкацэнтру—да 38 мл. руб. і асигнаваньні аўцаводчым калгасным фэрмам 18 млн. руб. шляхам перараз'мерканьня адпушчаных Наркамзему СССР фондаў доўгатэрміновых крэдытаў і за кошт рэзэрву фонду доўга тэрміновага крэдытаваньня.

Старшыня СНК СССР **В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).**

Сакратар ЦК УсеКП(б) **І. СТАЛІН.**

30-га ліпеня 1931 г.

Ліквідаваць прарыў у сенаўборачнай

Партыйныя, савецкія і калгасныя арганізацыі. Бабруйскага, Жлобінскага, Клічаўскага раёнаў не мабілізавалі мас на ўборку і расьцягнулі тэрміны

НІ АДНАГО ГА СЕНАЖАЦІ НЕ ПАКІНУЦЬ НЕ ЎБРАНЫМ

Уборку збожжа на ўдарныя тэмпы

Слуцак. (Наш кар.). Калгас «Пастор» 22 ліпеня выйшаў на ўборку збожжа. Работу распачалі трактарам са сноп авязалкамі. Брыгады калгаснікаў і калгасніц абвясьцілі сябе ўдарнымі.

Частка калгаснікаў канчаюць убіраць сена.

Рабочая сіла на полі расстаўлена правільна. Калгаснікі абяцаюць скончыць уборку ў тэрмін і поўнасьцю.

Ал. Курдо.

Жлобін правальвае сенаўборку

ЖЛОБІН. 27-VII (Белта). На Жлобінскім раёне, на плану павінна быць скошана і ўбрана 30 тыс. га сенажаці і 1.654 га культурных траў. Па вестках Райза калгасамі і саўгасамі па сёньняшні дзень плян выкананы толькі на 55 проц., а па адназасобным сэктарам—на 29 проц. Райза і Райкалгассаюз да гэтага часу не наладзілі апэрацыйнага кіраўніцтва сенаўборкай: Адназасобны сэктар зусім выпаў з-пад кіраўніцтва. Сельсаветы таксама стаяць у баку ад гэтай кампаніі. Калі зараз ня прыняць тэрміновых мер сенаўборачная кампанія будзе сарвана.

Сенаўборку думаюць скончыць пасьля

Калгас «Курганы» (Нова-Максімаві кі сельсавет Клічаўскага раёну) зусім слаба падрыхтаваўся да ўборачнай кампаніі. Ён паваг ня склаў пляну ўборкі сенажаці. У калгасе няма працоўнай дысцыпліны. Рабочая сіла няправільна расстаўлена. Сярод калгаснікаў зусім не разгорнута ўдарніцтва і сацспаборніцтва. Зьдальшчына скажаецца, няма правільнага вучоту работы ў працаднёх. З гэтай прычыны палова сенажаці яшчэ да гэтага часу ня ўбрана.

Я. Рубашны.

У Бабруйскім раёне сенаўборка праходзіць чарапашымі тэмпамі

Уборка сена па Бабруйскім раёне праходзіць надавычайна марудна. На сёньняшні дзень плян сенаўборкі выкананы на 66 процантаў. Пляны ўборкі не даведзены да калгаснікаў. З боку райкалгассаюзу, раённага зямельнага аддзелу і сельсаветаў адсутнічае апэрацыйнае кіраўніцтва ў правядзеньні ўборачнай кампаніі. Гэтыя ўстановы ня маюць нават поўных зьвестак аб становішчы сенаўборкі па раёне. У шмат якіх калгасах не хапае рабочай сілы. Ім патрэбна дапамагчы, а райкалгассаюз і раённы зямельны аддзел, ні сельсаветы ня думаюць аб гэтым. Толькі 28 ліпеня райкалгассаюз разаслаў калгасам дырэктыву, каб яны выслі на дапамогу адстаючым калгасам ва ўборцы сена. У большасьці калгасаў да гэтага часу ня ўведзена зьдзельшчына. Усяго ў раёне налічваецца 116 калгасаў, а на 25 ліпеня пераведзены на зьдзельшчыну толькі 53, ды і то ў радзе гэтых калгасаў зьдзельшчына ўведзена фармальна Ня ма належнага вучоту выпрацоўкі, не вядзецца індывідуальнага вучоту працадзён і якасьці працы кожнага калгаснікa, не ліквідавана абязьлічка.

Раўняе сіласаваньне па раёне сарвана. Замест вызначаных па пляну 13 тысяч тон сілосу закладзена толькі 75 тон у калгасах і 40 тон ў саўгасах. Камсамол, які зьяўляецца штабам сіласаваньня зусім нічога не зрабіў, каб дапамагчы сіласаваньню, не разгарнуў масавай кампаніі, не мабілізаваў грамадзкасьці вакол гэтага пытаньня.

У апошні час у раёне ў сувязі з абвешчаным месячнікам правяркі падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі арганізаваны штаб па кіраўніцтву правяркаю ўборкі. Вылучана для пасылкі на работу ў раён 25 чалавек раённага актыву, але частка гэтых мабілізаваных на вёску ня выехала

Трэба прыняць радыкальныя меры да паскарэньня ўборкі сена, бо ў іншым выпадку частка сена застанецца ня ўбранай да восені. Гэтага дапусьціць нельга. Пераключыўшыся на баль шавіцкія тэмпы працы раён павінен ліквідаваць прарыў у сенаўборцы ў самы кароткі тэрмін!

Брыгада «Сав. Бел.» **А. Дамброўскі, А. Пядорышк.**

Скажэньне зьдзельшчыны

Ня гледзячы на пастановы 6-га зьезду саветаў аб пераводзе калгасаў на зьдзельшчыну калгас «Ленінскі Маяк» Асьвейскага раёну яшчэ не пераведзены на зьдзельшчыну. На агульным сходзе калгаснікаў была вынесена пастанова аб пераходзе на зьдзельшчыну. Праўленьне калгасу абяцала, але і да гэтага часу зьдзельшчына не ўведзена. Працоўныя дні ўлічваюцца не па колькасьці і якасьці выкананай работы, а па адпрацаванаму часу, у выніку атрымліваецца звычайная падзёншчына.

Праўленьне калгасу недаацэньвае ролі зьдзельшчыны. Трэба прыняць да праўленьня калгасу рашучыя меры, каб яно ўзялося за работу і ліквідавала усе хібы ў арганізацыі работы ў калгасе, увяло зьдзельшчыну, наладзіла правільны учот работы ў працаднёх.

Хмель.

УДЗЕЛЬНІКАМ ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЫ

Таварышы!

У Саюзе Саветаў пачата і з кожным годам усё больш магутна, пасьпяхова расьце работа па буда

Чарговы правал „лёкаў“ нямецкага капіталізму

Перагаворы ў Бэрліне закончыліся нічым

БЭРЛІН, 29-7. Наперакор шматлікім заявэньням як з ангельскага—так і французскага боку аб станоўчых выніках перагавораў, якія вялі ў Бэрліне нямецкія міністры з Макданальдам і Гендэрсонам, у афіцыйных бэрлінскіх палітычных колах, усё больш адкрыта прызнаюць ,што наведваньне ангельскіх міністраў не дало чакаемых вынікаў. Асноўнае пытаньне ,пытаньне аб прадстаўленьні для Нямеччыны фінансавай дапамогі не пасунулася ні на крок наперад. Аднэй з прычын гэтага зьяўляецца фінансавы крызіс, які разгарнуўся ў апошнія часы ў Англіі.

У нямецкіх палітычных колах падкрэсьліваюць ,што на мёртвым пункце застылі і перагаворы па пытаньні аб разбраеньні. Ангельскім міністрам не ўдалося пераканаць нямецкі ўрад адмовіцца ад пабудовы браняносца і прыняць праект канвэнцыі па разбраеньні, як аснову для далейшых перагавораў.

ЛЁНДАН. 29-VII. Лёнданскія газэты працягваюць даваць вельмі стрыманыя паведамленьні аб выніках паездкі Гендэрсона і Макданальда ў Бэрлін. Толькі бэрлінскі карэспандэнт «Дэйлі Мэйль» робіць спробу падняць заслону над закулісными перагаворамі, якія вяліся ў Бэрліне. Паводле слоў карэспандэнта, Макданальд заявіў нямецкім дзелавым колам, што калі Нямеччына будзе праводзіць дэмпінг у Англіі з мэтаю атрыманьня валюты, лейбарыстскі ўрад будзе прымушаны зараз жа прыняць рашучыя контр-меры.

«Дэйлі Тэлеграф» заяўляе, што перагаворы аб крэдытах зараз знаходзяцца на мёртвым пункце. Брытанскія бакі прадстаўлены ў перагаворах прадстаўніком банку Шоэдэр Тайэрсэн, амэрыканскія банкі Генонам, прадстаўніком «Чэйс нэшонэл банк». Прадстаўнікі швэдзкіх і галяндзкіх банкаў таксама ўдзельнічаюць у перагаворах. Перагаворы зараз ня ідуць наперад з-за таго, што Генон прадстаўляе ня ўсе амэрыканскія банкі, а толькі большасьць іх, а галяндзкія банкі пакінулі за сабой права ў любы момант у залежнасьці ад ходу перагавораў акрэсьліваць сваю пазыцыю

НА КАНГРЭСЕ САЦЫЯЛ-ІНТЭРВЭНТАЎ

Размовамі аб разбраеньні сацыял-інтэрвэнты імкнуцца прыкрыць шаленую падрыхтоўку да імпэрыялістычнай вайны

ВЕНА. 31-VII. На кангрэсе II інтэрнацыяналу скончыліся спрэчкі ра рэзалюцыі аб разбраеньні. У процілегласьць рэзалюцыі камісіі, ангельскія так званыя незалежныя с.-д., «бундаўцы» з Польшчы, і польскія «незалежныя сацыялісты» прапанавалі сваю рэзалюцыю насычаную фальшывымі «радыкальнымі» сказамі, заклікаючымі Швэйцарац Шмідт прачытаў заяву, у якой швэйцарскія сацыял-дэмакраты адхіляюць рэзалюцыю камісіі, як створаную ў рабочай клясе ілюзію, нібы яны хочуць правесьці разбраеньне праз Лігу Нацый. Аднак, ў інтарэсах адзінства швэйцарская сацыял-дэмакратыя ўстрымліваецца ад галасаваньня. Рэнадэль лічыць, што назваць Лігу Нацый імпэрыялістычнай—тактычная памылка, паслабляючая пазіцыі сацыял-дэмакратыі. Сацыял-дэмакраты павінны ўзмацняць сацыялістычны ўплыў у Лізе Нацый і дамагчыся ўцягненьня Амэрыкі ў Лігу. Рэнадэль прапануе за прасіць Савецкі Саюз, які ўдзельнічае ў падрыхтоўчай канфэрэнцыі па разбраеньні, быць пасьлядоўным і ўступіць у Лігу Нацый.

Пленум пераходзіць да галасаваньня рэзалюцыі на прынцыпу карпаративнасьці, г. зн. па дэлегацыях. За рэзалюцыю камісіі падана 304 галасы, супроць 2 ангельскія незалежныя, адзін польскі незалежны. Швэйцарская дэлегацыя ўстрымалася ад галасаваньня.



Паліцыя ідзе ў атаку на паўстаўшых нацыяналістых (гор. Мазура. Эгіпэт).

партыі II-га інтэрнацыяналу «праводзіць рэвалюцыйны націск на ўрады, каб перашкодзіць узьнікненьню вайны», а ў выпадку, калі вайна будзе абвешчана ,спыніць яе «шляхам зьвяржэньня капіталізму».

Рэзалюцыя патрабуе таксама «барацьбы сацыял-дэмакратычных партый ўсіх краін за разбраеньне», пры чым зусім не ўспамінаецца савецкі праект аб разбраеньні.

Прадстаўнік ангельскай незалежнай рабочай партыі Браквэй, абараняючы прапанову меншасьці, адзначыў, што рэзалюцыя большасьці, якая перадае справу разбраеньня Лігі Нацый, выклікае расчараваньне рабочых мас.

Усеагульная забастоўка тэкстыльшчыкаў у Бамбэі

ЛЁНДАН. 29-VII. Як паведамляюць з Бамбэю, 30.000 рабочых тэкстыльшчыкаў абвясьцілі забастоўку ў Шэлапуры. Буйныя сілы паліцыі ахоўваюць тэкстыльныя фабрыкі і нясуць пост рульную службу на тэрыторыі забастоўкі.

Бамбэйскія тэкстыльшчыкі ў звароце да шэлапурскіх тэкстыльшчыкаў заявілі аб сваёй салідарнасьці з забастоўшчыкам. Рабочыя аднэй з бамбэйскіх фабрык абвесьцілі забастоўку салідарнасьці. Бастуючыя рабочыя арганізавалі пікэтаваньне тэкстыльных фабрык. Прадпрыемцы спрабуюць наладзіць работу штрэйкбрэхераў пры дапамозе паліцыі. Некалькі рабочых параненa, значная колькасьць іх арыштавана.

Ангельскі друк аб прыезьдзе ў СССР Бэрнарда Шоу

ЛЁНДАН. 31-VII. Камэнтуючы паведаньне Бэрнардам Шоў СССР «Спэктатар» (ангельскі кансэрватыўны часопіс) піша: хоча ён гэтага ці ня хоча, Бэрнарду Шоу суджана адыграць пэўную ролю. «У Маскве нямінуча будуць разглядаць кожную яго вастрату, як тлумачэньне сучаснай Англіі. У Англіі-ж пасьля яго звароту з СССР на яго будзе шырачэзны запыт як на тлумачальніка сучаснай Расіі».

Пераўвялічаны малюнак Англіі, які Бэрнард Шоў малюе савецкай аўдыторыі, не адыгрывае ролі. «Аднак, вялікую ролю адыгрывае, ці скажа Шоў пасьля звароту ў Лёндан, таксама лёкадумна, як гэта ён сказаў у Маскве, што Англія павінна была першай правесьці савецкі экспэрымэнт ,ці ён сурёзна возьме на сябе задачу асьвятленьня ўсіх моцных і слабых бакоў савецкай сыстэмы, якія адкрыюцца яго пранікліваму эроку».

Баявы мітынг беспрацоўных у Сьветахлавіцах

ВАРШАВА. 26-VII. Польскі друк паведамляе, што ў Сьветахлавіцах пазаўчора адбыўся масавы мітынг беспрацоўных. Пасьля мітынгу беспрацоўныя, прарываючыся праз кардоны паліцыі, прайшлі па некалькіх важнейшых вуліцах гораду з лёзунгамі «хлеба і працы». Настрой рабочых—беспрацоўных вельмі бурлівы. На мітынгу, як зазначае «Газэта Варшаўская», было некалькі «яскрава выражаных анты-дзяржаўных прамоў». Становішча ў горадзе вельмі напружанае. Паліцыя кожную ноч ўчыняе масавыя арышты сярод западозраных у камуністычнай дзейнасьці.

Забастоўка на праводцы кабелю Мысловец-Бжэзінка

ВАРШАВА. 26. Як паведамляе «Газэта Варшаўска», тэтымі днямі рабочыя, якія заняты праводкай кабелю Мысловец-Бжэзінка, абвясьцілі забастоўку. Прычынай забастоўкі зьяўляецца новае зьніжэньне зарплаты рабочым і пагоршаньне ўмоў працы.

Паліцыя ўчыняе масавыя арышты рабочых.

Забастовачны фронт у Сафіі пашыраецца

ВЕНА, 20-7. З Сафіі паведамляюць, што там незалежныя рабочыя прафсаюзы стварылі цэнтральны забастовачны камітэт, які падрыхтоўвае і арганізуе забастоўкі і кіруе імі.

Паводле паведамленьня камітэту, забастоўкі адбываюцца на цэлым радзе тэкстыльных, тытуновых і іншых фабрык. Закончыліся перамогай рабочых забастоўкі рабочых цагельнага заводу блізка Сафіі, рабочых гуты блізка Варны, рабочых мэблявай фабрыкі ў Кюстэндзіле. Рабочыя дамаглися павялічэньня заработку на 25-30 проц. і 8 гадзіннага рабочага дню.

Нямеччына ў агні забастовачных баёў

БЭРЛІН. 30-VII. Міністр працы Штэгервальд абвясьціў сёньня абавязковае рашэньне трацейскага суда аб зьніжэньні заработку рабочых паўночна-заходняй групы мэталяпрамысловасьці. Ня гледзячы на абвяшчэньне трацейскага рашэньня абавязковым, рэвалюцыйная прафапазыцыя агітуе за абвяшчэньне забастоўкі.

У радзе месц Нямеччыны адбываюцца забастоўкі пратэсту супроць зьніжэньня заработку і затрымкі з яе выплатай. Рабочыя друкарні «Брэмэр» у Браслаўлі пачалі забастоўку супроць спробаў прадпрыемцаў скараціць рабочы час да 35 гадзін у тыдзень з ад паведным зьніжэньнем заработку.

Ужо сёмы дзень бастуюць 5.000 гарнякоў у Дылінгу (Саарская вобласьць супроць зьніжэньня заработку. Спробы дырэкцыі прарваць забастовачны фронт засталіся бяз вынікаў. У радзе іншых прадпрыемстваў Саарскай вобласьці робяцца спробы зьнізіць заработак, аднак прадпрыемцы ўсюды натыкаюцца на рашучае супраціўленьне рабочых.

Рабочыя лясного кіраўніцтва Лангебэлаў у Верхняй Сілезіі пачалі пад кіраўніцтвам чырвонага прафсаюзу сельска-гаспадарчых і лясных рабочых забастоўку. Рабочым у мінулым тыдні была выплачана толькі адна трэцяя частка належачага ім заработку.

У Гоффунгогале, ля Кельну, выбухнула забастоўка 200 беспрацоўных, якія заняты на прымусовых работах. Рабочыя патрабуюць сваячасовай выдачы зарплаты і скарачэньня рабочага часу з 8 да 7 гадзін. Супроць бастуючых паслана паліцыя.

Бандыцкі напад паліцыі і сацыял-фашыстаў на камуністычны сход у Бэрліне

БЭРЛІН. 31-VII. Адбыўся вялікі сход, скліканы кампартыяй ў парадку падрыхтоўкі да ўсенароднага галасаваньня па пытаньні аб роспуску Прускага ляндтагу.

На сход напаў аб'яднаны атрад паліцыі і членаў на чале з сацыял-дэмакратамі буржуазнай паўваеннай арганізацыі «Рэйхсбанэр», колькасьцю ў 100 чал. Нападзеньне ўзгалаўлялася 3-ма сацыял-дэмакратычнымі дэпутатамі прускага ляндтагу і адным з рэдактараў «Фарвэртса». Сыгнал да выступленьня быў даны пасьля прамовы тав. Гірша, калі яўна выявілася спачуваньне шматлікіх прысутных на сходзе сацыял-дэмакратычных рабочых кампартыі. Пасьля прамовы Гірша ўдзельнікі сходу засьпявалі Інтэрнацыянал. Арганізаваныя сацыял-фашысцкія дружыньнікі засьпявалі з свайго боку свае фашысцкія песьні. Паміж рэвалюцыйнымі рабочымі і сацыял-фашысцкімі правакатарамі пачалася бойка .Тады ў справу ўмяшаліся паліцэйскія, якія зрабілі 4 стрэлы і пры дапамозе членаў рэйхсьвера арыштавалі 20 рабочых. У ліку арыштаваных знаходзіцца і т. Гірш.

Чарговае абяцаньне Чан-Кай-Шы аб перамозе над чырвонымі...

якому мала хто верыць

ШАНХАЙ, 27-VII Чан-Кай-Шы апублікаваў новую дэкларацыю «Да народу», у якой зноў клянецца, што ў барацьбе з Чырвонымі ён або пераможа, або загіне. У дэкларацыі прызнаецца рэзкае абвастрэньне становішча ў сувязі з паўстаньнем на поўначы і падзеямі ў Карэі.

ШАНХАЙ, 27-VII. Паліцыя міжнароднага кварталу ўчыніла рад вобыскаў і арыштаў. Арыштаваныя абвінавачваюцца ў прыналежнасьці да кампартыі.

ШАНХАЙ, 28-VII. У ангельскай газэце зьмешчана дэкларацыя члена кантонскага ўраду, сына Сун-Ят-Сена Сунь-Фо, у якой гаворыцца: «У працягу месяца вайсковыя начальнікі, якія знаходзяцца пад камандай Фон-Юй-Сяна і Ян-Сі-Шаня, рушацца сумесна з намі супроць Чан-Кай-Шы».

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ
Стар. 2 № 176 (3265)

ЯМЫ І ТРАНШЭІ НЯ БУДУЮЦЦА

Ліпнёўскі плян сіласаваньня кармоў сарваны

Зламаць апартуністычнае супраціўленьне сіласаваньню

Сіласаваньне ў Магілеўшчыне пад пагрозай зрыву

МАГІЛЁЎ. (Наш кар.). Раённыя арганізацыі, сельсаветы і праўленьні калгасаў яшчэ не павярнуліся тварам да сіласаваньня. Па некаторых калгасах папыраны школіныя разважаньні, што «няма чаго сьпяшацца з сілосам ,бо сёлета ёсьць шмат сена» («Чырвоны Сормавец», Чырвонаармейская камуна і інш.).

Раённыя і мясцовыя арганізацыі забыліся, што раён мае жывёлагадоўчы ўхіл, што стварэньне кармовай базы адыгрывае выключную ролю для Магілеўскага раёну. Між тым, па раёне справа сіласаваньня знаходзіцца ў пагражаючым становішчы і прымушае біць трывогу. Да гэтага часу засіласавана ўсяго 72 тоны ці 0,6 проц. пляну. Толькі тры калгасы па-баявому ўзяліся за выкананьне гэтага важнейшага мерапрыемства: калгас «Новы Сьвет», Княжыцкага сельсавету, які засіласаваў 30 тон, калгас «1-га мая»—25 тон, імя Леніна—17 тон. Астатнія 152 калгасы нічога не зрабілі ў гэтым напрамку. Да гэтага часу выкапана ўсяго 24 ямы. Саўгасы і прыгарадныя гасгаспадаркі ЦРК таксама ня цікавяцца сіласаваньнем кармоў.

У баку ад сіласаваньня стаіць і камсамол .Ён запамятаў, што зьяўляецца пэфам сілосу. Як раённы камітэт камсамолу, так і ячэйкі на мясцох нічога не зрабілі ў гэтым напрамку Камсамол ня цікавяцца ходам сілоснай кампаніі.

Райкалгассаюз не праявіў жывога інструктажу; ён мяркуе, што хопіць абежніжаў ,каб выканаць плян сіласаваньня.

Трэба пакласьці канец бязьдзейнасьці. Кулацкі ўплыў, апартуністычная недаацэнка і стаўка на самацёк у справе стварэньня магутнай кармовай базы павінны быць ліквідаваны. Раённыя арганізацыі павінны неадкладна павярнуцца тварам да сіласаваньня пераключыцца на ўдарныя тэмпы, мабілізаваць калгасныя і бяднацка-серадняцкія масы на выкананьне сіласаваньня ў раёне.

Сяньневіч.

Шклоўшчына не пераключылася на ўдарныя тэмпы сіласаваньня

ШКЛОЎ. (Наш кар.) Пра карысьць сілосу гаварыць ня прыходзіцца, бо пра гэта ведае кожны. Вынік сіласаваньня мінулага году зьяўляецца лепшым агітатарам за сілос.

Аднак, ня гледзячы на яўную карысьць сілосу, у Шклоўшчыне сілосная кампанія не разгарнулася як сьлед. У раёне трэба пабудаваць 163 сілосныя ямы і 2 вежы. На сёньняшні-ж дзень пабудавана ўсяго 30 ям.

Першымі ўдарнымі ў раёне па пабудове ям і закладцы сілосу аказаліся калгасы «Ударнік», «Сормава» і імя Фрунзэ. Гэтыя калгасы дабіліся посьпехаў у справе сіласаваньня, дзякуючы таму, што ў іх ліквідавана абязьлічка. Па пабудове ўстановак калгасы вылучылі аднаго адказнага калгасніка, які сочыць за сваячасовым выкананьнем пляну.

Волыт гэтых калгасаў павінен быць перанятны ўсімі іншымі калгасамі раёну. Трэба рашуча ліквідаваць недаацэнку сілосу і па-бальшавіцку ўзяцца за правядзеньне сіласаваньня кармоў.

Райкалгассаюз павінен разгарнуць жывое кіраўніцтва будаўніцтвам ям і траншэй і сіласаваньнем кармоў.

Г. Ш.

Раньняе сіласаваньне ў Аршанчыне сарвана

ВОРША (Наш кар.) Паводле пляну, сёлета па 15 сельсаветах (у межах старога раёну) павінна быць закладзена 16.088 тон сілоснай масы, а калі прыняць пад увагу, што раён у сувязі з часткавым перараёньваньнем у два разы павялічыўся і сельсаветаў замест 15 стала ўжо 30, то і лічба па закладцы сілоснай масы павінна павялічыцца ў два разы. Але пакуль што пэўных лічбаў па сіласаваньні ва ўзбуйненым Аршанскім раёне няма. Ня гледзячы на тое, што пасьля ўзбуйненьня мінула ўжо ня мала часу, ні райза, ні калгассаюз яшчэ нічога не зрабілі, каб устанавіць пляновую лічбу па сіласаваньню.

З аднаго боку не хапае работнікаў як у райза, так і ў райкалгассаюзе, бо з ліквідаваных раёнаў яшчэ ніводнага работніка для ўмацаваньня ня далі. З другога боку, сельсаветы і партыйныя ячэйкі, а таксама і праўленьні калгасаў мала аддаюць увагі сіласу, у многіх ён зусім не ў пашане. Сам райкалгассаюз ня ведае, што робіцца ў калгасах у справе сіласаваньня, а гэта значыць, што ён і не кіруе ёй.

— У нас ужо засіласавана 59 тон зялёнай масы ў двух калгасах,—кажа старшыня райкалгассаюзу т. Масалкоў, калі ў яго запытаюць пра сілас.

Да 1 жніўня павінна быць засіласавана 30 проц. зялёнай масы, а 59 тон ні ў якім разе не складаюць 30 проц. нават і старага раённага пляну. Такім чынам трэба проста сказаць, што раньняе сіласаваньне па Аршанскім раёне сарвана.

ПРАДПРЫЕМСТВЫ ЛЕСБЕЛУ НЕ ДАСЫЛАЮЦЬ ВЕЖЫ.

У гэтым годзе ў калгасах і саўгасах раёну павінна быць пабудавана вежа ёмістасьцю на 5.200 тон сілоснай масы. Да іх будаўніцтва ўжо ўсё гатова, але затрымка ў тым, што Лесбел не дасылае вежа.

Горш справа з рамонтам старых ям і траншэй і з пабудовай новых. Па пляну павінна быць пабудавана ям і траншэй ёмістасьцю на 32.175 кубамэтраў. На сёньняшні дзень пабудавана толькі на 1580 куб. мэтраў.

Такім чынам мы бачым, што сіласнае будаўніцтва зацягнулася, раньняе сіласаваньне сарвана, а гэта пагражае зрывам наогул усіх плянаў сіласаваньня, бо ўвосень для выкананьня пляну ня хопіць зеляніны.

Так на Аршаншчыне сіласаваньне, як і сенаўборка — дзьве важнейшыя рэчы ў стварэньні кармовай базы—апынуліся пад пагрозай зрыву і гэтым паставілі пад пагрозу і забесьпячэньне жывёлы кормам наогул.

Ал. Таежны.

Будуюць сілосныя вежы

Саўгасы Дукора і Зазер'е, Пухавіцкага раёну, шырока разгарнулі будаўніцтва сілосных вежаў. У саўгасе Дукора летась была толькі адна сілосная вежа на 60 тон, а зараз будуецца другая такога-ж памеру.

У саўгасе Зазер'е будуецца мураваная вежа ёмістасьцю ў 100 тон. Работа праводзіцца ўдарна.

Ц. Л.

Віцебшчына выканала плян сіласаваньня на 1 проц.

ВІЦЕБСК. (Наш спэцкор). Па раёне сіласаваньне кармоў амаль не праводзіцца. Да гэтага часу плян сіласаваньня выканан ледзь на 1 проц. У калгасах імя **Сталіна**, імя **Ланцуцкага**, імя **Дзяржынскага** сіласаваньне кармоў толькі пачынаецца. У калгасах **«Зьвязда»**, **«Старое Село»**, імя **Чарвякова**, яшчэ ня прыступлена да будаўніцтва сілосных установак. Толькі падрыхтаваны ямы ў калгасах імя **Войкава**, **«Шлях да сацыялізму»** і **«Бальшавік»**.

Трэба адзначыць, што камсамольскія арганізацыі, апрача абяцаньняў у правядзеньні сілоснай кампаніі, нічога ня робяць. Ня гледзячы на тое, што камсамол узяў шэфства над сіласам, да апошняга часу ў гэтай галіне практычна нічога ня зроблена. Райкалгассаюз таксама праяўляе поўную нядбайнасьць да пытаньня сіласаваньня кармоў, зусім забываючы аб важнасьці сілосу для разьвіцьця жывёлагадоўлі.

Трэба зараз-жа пераключыцца на ўдарныя тэмпы па правядзеньні сілоснай кампаніі. На працягу бліжэйшых дзвюх неабходна ліквідаваць усе прарывы на фронце сіласаваньня.

Гарын.

Выканаць дырэктывы партыі і ўраду па здабычы торфу

Пасьля пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР зрух на Асінторфе ёсьць, але гэты зрух недастатковы. На 28-VII—31г. заданьне выканана толькі 34,7 проц.

Асобныя брыгады тарфянікаў паказваюць бальшавіцкія прыклады работы

Увесь час у справе здабычы торфу ідзе брыгада Аўдошкіна, Т.—якая выканала свой прамфінплян на 118,9 проц. пры 136,1 проц. вытворчасьці працы на аднаго рабочага. За гэтай брыгадай ідзе брыгада Сярогіна ,якая выканала свой прамфінплян на 80,9 проц. пры 105,3 проц. вытворчасьці працы на аднаго рабочага.

Брыгада Грышчанка выканала прамфінплян на 74 проц., брыгада Макушына 81 проц., брыгада Красоўскага на 73 проц.

Астатнія брыгады цягнуцца ў хвасьце, а брыгада Мілячэнка зусім ганебна адстае ў справе выкананьня прамфінпляну. Гэта брыгада выканала свой прамфінплян на 46,8 проц. пры 63,9 проц. вытворчасьці працы на аднаго рабочага.

За апошнія дні брыгады Аўдошкіна, Сярогіна, Масарава і Баркоўскага ўзялі яшчэ большыя тэмпы ў торфаздабычы і выкананьні прамфінпляну. Калі брыгада Баркоўскага 18 ліпеня дала ў дзень 19.460 цэглін, то 25 ліпеня яна ўжо дала 35.000. Брыгада Сярогіна дала за 21 ліпеня 34.780 цэглін, брыгада Аўдошкіна—21 ліпеня дала 36.650 цэглін у той час, як 20 яна дала 33.768 цэглін.

Так па ўдарнаму працуюць лепшыя брыгады тарфянікаў, так яны выконваюць загады партыі і ўраду. З іх павінны браць прыклад усе астатнія брыгады і тады тыя прарывы, якія ёсьць зараз на Асінторфе будуць лёгка і хутка ліквідаваны.

Неадкладна зьнішчыць перашкоды

У той час, калі лепшая частка рабочых з кожным днём павялічвае тэмпы ў торфаздабычы, дабіваецца выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну, а гэтым самым выконвае дырэктывы партыі і ўраду, каб даць торфапрамысловасьці—энэргію для фабрык і заводаў, партыйнае, гаспадарчае і прафэсыянальнае кіраўніцтва Асінторфу вельмі марудна і туга паварочваецца тварам да бальшавіцкага выкананьня рашэньняў Партыі і Ўраду па ліквідацыі прарываў на Асінторфе.

Машыны ўсе яшчэ абязьлічаны і без кантрольны, большасьць брыгад таксама. Культбытавое абслугоўваньне рабочых усё яшчэ не наладжана. Гаспадарнікі і прафпаўнаважаныя ня ведаюць сваіх ударнікаў. Каапэрацыя ўсё яшчэ не павярнулася тварам да лепшых ударнікаў, усё яшчэ не наладзіла іх абслугоўваньне. Зусім дрэнна працуе гаспадарчая частка канторы Асінторфу. Яна ня справілася з прыёмам і разьмяркаваньнем новых рабочых. Першыя два дні прыбыўшыя рабочыя хадзілі зусім без работы. Не наладжана і іх абслугоўваньне.

Як не назваць шкодніцтвам такое галавацяпства, такую непаваротлівасьць з боку загадчыка гаспадарчай часткі Асінторфу Івашкевіча, які ня можа арганізаваць і наладзіць дастаўку вады на месцы работ для рабочых? Хапае людзей, хапае коней, бочак і г. д., але ваду ўёс-ж такі не падвозяць. Івашкевіч упарта не выконвае загад дырэктара Асінторфу і гэтым самым зрывае пасьпяховае выкананьне прамфінпляну. Рабочыя прымушаны бегаць, каб напіцца вады за тры кілёмэтры, альбо прастойваць у чарзе каля аднаго чайніка.

Торфазьбіральнік, які нядаўна прыбыў на Асінторф, зьбіраецца вельмі марудна, бо адміністрацыя ня стала на чале працоўнага ўздыму рабочых і не стварыла ўмоў, каб хутчэй сабраць Торфазьбіральнік. У зборцы нават няма тэхнічнага кіраўніцтва. І ўсё гэта ў той час, калі група ўдарнікаў за 2 дні сабрала камутара, калі на гэту работу патрэбна было затраціць ня менш 2 тыдняў. Вось гэтыя ўдарнікі, яны даюць прыклады бальшавіцкай ударнай работы: З. В. Корбут, В. М. Фэськоў, М. Яроменка, В. Радзівонечка і М. Мацьвеенка.

Гэткія прыклады сапраўднай ударнай работы, як і мэтады работы тых брыгад, якія выконваюць і перавыконваюць свой прамфінплян, трэба пашырыць сярод усёй рабочай масы. Рабочая маса таксама павінна ведаць і сваіх герояў у торфаздабычы. Але і тут сказваецца непаваротлівасьць трыкутніка Асінторфу, але і тут нічога ня робіцца.

Аб тым, што грамадзкае харчаваньне рабочых на Асінторфе ўсё яшчэ не наладжана ,сьведчыць тое, што ў сталоўцы пасёлку № 5 заўсёды вялізная чарга. Рабочыя прымушаны чакаць па дзьве гадзіны сьнеданьня, ды ісьці на работу не пасьнедаўшы. Загадчык сталоўкі ня прымае мер ,каб наладзіць работу. У гэтай-жа сталоўцы і харчы дрэннай якасьці.

Трэба да гэтага яшчэ дадаць, што Ворша дрэнна выконвае дырэктывы партыі і ўраду ад дапамозе Асінторфу людзьмі. Райком партыі мабілізаваў трох адказных работнікаў на Асінторф—Магарылу (завод «Чырвоны Кастрычнік»), Сухадольскую — (РК КП(б)Б), Грынберга—(дырэктар Тэкстыльнага камбінату).

Магарыла і Сухадольская толькі паказаліся на Асінторф, а зараз блытаюцца ў Воршы, а Грынберг і зусім не паехаў туды. Яны як відаць лічаць для сябе не абавязковым выконваць дырэктывы Райкому партыі і наогул дырэктывы партыі.

Ня выканана пастанова аб пасылцы на Асінторф у двухдзенны тэрмін адміністрацыйна гаспадарчага пэрсаналу. З Воршы замест трох чалавек прыбыло толькі два. Не зьявіліся яшчэ рахункаводы. Белкаапсаюз ня выканаў пастанову аб прысылцы каапэрацыйных работнікаў, аб паляпшэньні абслугоўваньня рабочых-тарфянікаў. Не хапае прадуктаў: круп, няма гародніны і іншага. Таксама дрэнна справа і з кухарамі. Працуе толькі адзін кухар прыбыўшы з Менску, а прыбыўшыя з Воршы два кухары—уцяклі назад.

Усе гэтыя непаладкі: адсутнасьць належнай увагі Асінторфу з боку некаторых арганізацый вельмі і вельмі затрымліваюць пасьпяховае разгортваньне штурму прарываў у справе торфаздабычы і забесьпячэньні торфам БелДРЭСу. Гэтыя непаладкі павінны быць неадкладна ліквідаваны. Трэба яшчэ дадаць, па бальшавіцку ўдарыць па ўсіх праявах нежаданьня выконваць дырэктывы партыі і іх ігнараваньне. Трэба заганьбіць дэзэртырства мабілізаваных на торфараспрацоўкі, трэба стварыць навокал гэтага грамадзкую думку ,трэба давесьці ўсе рашэньні ЦК партыі, Саўнаркому БССР і бюро райкому партыі да кожнага рабочага і дабіцца іх няўхільнага выкананьня. Толькі пры гэтых умовах, прарывы будуць ліквідаваны і Асінторф дасьць апал БелДРЭСу, а апошні забясьпечыць жыцьцёвай энэргіяй фабрыкі і заводы.

Ар. Таежны.

Дапамажэце „Камунарцы“ ліквідаваць прарыў

Адкрыты ліст

Да Менгарсавету, Гарпрафсавету, ЦП саюзу, мукамольна-кандзіцерскай прамысловасьці, Белдзяржбуду, Цепласанцестрою, Белсельпрому, Наркамснабу, друкарні імя Сталіна, заводу імя Варашылава, газэт «Зьвязда», «Савецкая Беларусь», «Рабочий»

Ад рабочых і інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу ф-кі «Камунарка».

Таварышы!

Тав. Сталін у сваёй гістарычнай прамове ад 23-га чэрвеня даў разгорнутую праграму работы нашых прадпрыемстваў. Тав. Сталін выказаў думку ўсёй рабочай клясы Савецкага Саюзу, якая мабілізуе ўвагу на барацьбу за хутчэйшае завяршэньне фундаманту сацыялізму. Распрацавана і рэалізуецца гэтая прамова тав. Сталіна на фабрыцы «Камунарка».

Наша фабрыка, пабудаваная ў ліку 518, абсталявана нашымі машынамі, прадукцыі нашых уласных заводаў. Працускная здольнасьць фабрыкі магутная ,якая можа і павінна даць краіне гатовай прадукцыі на 24 мільёна руб. у год.

Будаўніцтва «Камунаркі»—гэта ёсьць гісторыя сацыялістычнага будаўніцтва СССР наогул, БССР у прыватнасьці.

Гэта ёсьць вырашэньне Ленінскай нацыянальнай палітыкі па ўзьняцьці матар'яльнага і культурнага ўзроўню былых адсталых прыгнечаных нацыянальнасьцяй, гэта ёсьць ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі: ператварыць БССР з краіны аграрнай ў краіну індустрыяльна-аграрную, гэта ёсьць ажыцьцяўленьне лініі партыі дагнаць і перагнаць у тэхніка-эканамічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны.

Але, ня гледзячы на тое, што фабрыка пачала працаваць 5-га чэрвеня, мы яшчэ ня можам ганарыцца сваімі дасягненьнямі. Мы маем на сёньняшні дзень глыбокі прарыў у выкананьні прамфінпляну. Для ліквідацыі гэтага прарыву рабочыя нашай фабрыкі пад кіраўніцтвам партыйнага калектыву распрацавалі канкрэтныя мерапрыемствы на падставе шырокай разгорнутай праграмы—прамовы тав. Сталіна.

Мы бярэм на сябе: а) поўнасьцю ліквідаваць абязьлічку, замацаваць цьвёрдыя зьмены рабочых да варштатаў і машын;

б) узьняць працоўную дысцыпліну, перавесьці ўсе галіны працы на поўную зьдзельшчыну;

в) для барацьбы з цякучасьцю рабочай сілы замацавацца за фабрыкай да канца першай пяцігодкі;

г) устанавіць камуністычныя адносіны да машын, сыравіны і гатовай прадукцыі;

д) яшчэ больш рашуча змагацца за якасьць выпускаемай прадукцыі і за колькаснае выкананьне прамфінпляну;

е) эканомна і беражліва выдаткоўваць апал, сыравіну, пару і асьвятленьне;

ж) прыняць усе захады да наладжваньня культурна-выхаваўчай работы цэху аграгату;

з) наладзіць культурна-бытавое абслугоўваньне рабочых шляхам арганізацыі ясьляў, палепшаньня работы сталоўкі і закрытага разьмеркавальніка.

Адначасна прад'яўляем рахунак устанавам і арганізацыям.

Гарсавету: а) у пяцідзённы тэрмін за бясьпечыць рабочых фабрыкі перасовачнымі сродкамі для рабочых (аўтобус).

б) Зараз-жа даць адпаведныя дырэктывы дарожа-будаўнічым арганізацыям для пабудовы пад'ездных шашы да фабрыкі .

в) У месячны тэрмін сплянаваць пляц фабрыкі і прыступіць да пабудовы бараку для рабочых адзіночак.

г) Не пазьней 1-га жніўня закончыць работу і абсталяваньне ясьляў.

Мендзяржбуду: прыступіць згодна ўмовы, да пабудовы канторы, пажарнага дэпо, і ў першую чаргу клюбу-сталоўкі.

Цепласнабу: у 5-цідзённы тэрмін канчаткова ўстанавіць вытворчую вэнтыляцыю.

Друкарні імя Сталіна: даваць добраякасную прадукцыю этыкетак, і сваячасова.

Трэсту Белсельхарчпрому: а) даваць сталыя праграмы вытворчасьці.

б) Аддзлелу снабзбыту плянава забясьпечыць фабрыку сыравінай і па плянавых цэнах, не дапускаючы да таго, каб здымаліся ліміты па 260 тыс. руб.

в) Трэсту ліквідаваць папяровае кіраўніцтва і спусьціцца непасрэдна ў цэхі, для аказаньня гаспадарчай і тэхнічнай дапамогі .

Наркамату працы—сэктару кадраў: тэрмінова вызначыць раён для вярбоўкі рабочай сілы .

Гарпрафсавету і ЦП саюзу: ліквідаваць папяровае кіраўніцтва і славесныя размовы аб кіраўніцтве і спусьціцца непасрэдна ў цэх, агрэгат, групу для дапамогі ўзмацненьня перабудовы прафпрацы.

Наркамснабу: павярнуцца тварам да фабрыкі, для аказаньня гаспадарчай і арганізацыйнай дапамогі.

Газэтам «Зьвязда», «Савецкая Беларусь» і «Рабочий»: дапамагчы ў рабоце па разгортваньні рабселькораўскага руху і наладжваньні сталага выхаду, як шматтыражкі, так і насьценовак.

Па даручэньні рабочых і інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу фабрыкі Сакратар к-ву КП(б)Б ФЭЛЬДМАН.

Дырэктар БЕЛЕНЬКАЯ.
Старшыня фабкому ГАЙТЛЕР.

Вось яны — Зрыўшчыкі сіласаваньня

⊙ Сіласаваньне кармоў у Шыркаўскім сельсавеце, Мсьціслаўскага раёну, не пачыналася. Усе 8 калгасаў сельсавету ня выкапалі ніводнай ямы.

Сельсавет, партыйная і камсамольская ячэйка нічога ня робяць, каб мабілізаваць масы вакол сілоснай кампаніі.

А. Палонскі.

⊙ У Сакалішчанскім сельсавеце, Расонскага раёну, сілосная кампанія праходзіць самацёкам. З 12 калгасаў толькі 1 пачаў капаць яму. Чэрвеньскі і ліпеньскі плян сіласаваньня сарваны.

Праўленьні калгасаў, партыйныя і камсамольскія ячэйкі не зварочваюць ніякай ўвагі на сіласаваньне кармоў.

Я. Шпакоўскі.

⊙ Па Якаўлеўскім сельсавеце, Аршанскага раёну, сілосная кампанія зусім не разгарнулася. Будаўніцтва сілосных установак не пачыналі.

М. С.

⊙ Сьмілавіцкае аддзяленьне Дзяржбанку затрымлівае выдачу крэдытаў. Клёпкі для сілоснай вежы, вызначаныя райкалгассаюзам калгасу «Чырвоны Прафінтэрн», ляжалі ня выкупленымі на ст. Рудзенск больш месяца толькі таму, што аддзяленьне банку тармазіла выдачу грошай.

Ракіта.

⊙ У калгасе «1 мая», Слуцкага раёну да сіласаваньня кармоў адносяцца нядбайна. Траву ад поліва гародаў адразу не выкарыстоўваюць для закладкі ў ямы, а чака

Масавая ўборка лёну

пачынаецца праз некалькі дзён

Калгасы „Зьмена“ і „Курганы“ зрываюць праполку, ільнацерабілкі стаяць без пасоў

Не губляць часу! Зруйнаваць перашкоды на шляху ўборкі лёну

Забясьпечыць лёнацерабілкі пасамі

Калгасы, якія абслугоўваюцца Дрыгінскай МТС, маюць 1.800 га пасеву лёну. Лён нарос добрым. Праз некалькі дзён пачнецца ўборка яго.

Трэба адзначыць, што поліва лёну крайнэ дрэнна. Аполата ўсяго 580 га, гэта ў поўнай ступені будзе тармазіць уборку лёну лёнацерабілкамі.

Падрыхтоўка да ўборкі лёну шырока разгорнута. Зараз праводзіцца кампанія па вёсках аб наладжваньні ўзаемадапамогі аднаасобнікаў ва ўборцы лёну калгасаў. Па калгасах арганізуюцца брыгады для ўборкі лёну. Прымаюцца захады, каб уцягнуць ва ўборку лёну ня толькі жанчын і падлеткаў, але і мужчын. Пашырана кансэрватыўная думка, што ўборка лёну — гэта «бабская» работа. Трэба разьбіць па добрым кулацкія забабоны, сёлета не абходна ўцягнуць ва ўборку лёну ўсе вольныя рукі, як жаночыя, так і мужчынскія.

Праводзіцца значная работа па арганізацыі дзіцячых ясьлёў. У найбольш буйных калгасах ясьлі ўжо існуюць. У тых калгасах, дзе ясьлёў няма, дзяцей будуць пакідаць пад дагляд адной жанчыны, каб даць магчымасьць усім жанчынам, якія маюць дробных дзяцей, прыняць удзел у рабоце.

Трактары адрамантаваны і прывезены ў парадак. МТС падняла к палецьцю 200 га цаліны.

Прымаюцца меры да арганізацыі мачыльных ям. Ёсьць небясьпека, што некаторыя ямы павысыхаюць. Зараз прыдзецца прыступіць да арганізацыі заставак ў праточных вадаёмах. Раённыя арганізацыі павінны ўжо пакланіцца аб гэтым.

Дрэнна абстаіць справа з будаўніцтвам лёназаводу ў Бігосаве. Да будаўніцтва заводу толькі яшчэ прыступаюць: кладзецца падмурак, падвозіцца матар'ял. Трэба забясьпечыць ударнае правядзеньне будаўніцтва заводу, каб сёлета можна было-б прыступіць да апрацоўкі лёну.

І, нарэшце, неабходна сыгналізаваць аб тым, што завезеныя дзьве лёнацерабілкі не забясьпечаны гумовымі пасамі. Без пасоў лёнацерабілкі ня могуць працаваць, між тым, праз некалькі дзён пачнецца ўборка лёну.

К. І.

2 лёнацерабілкі ляжаць бяз руху на ст. Вятна

Лепельскай МТС накіраваны дзьве лёнацерабілкі. З прычыны таго, што вялікія грузы нельга падвозіць зараз да Лепелю, лёнацерабілкі выгружаны на ст. Вятна. Хутка прыдзецца пачаць уборку лёну, а машыны знаходзяцца за 60 клмтр. Апроч усяго гэтага, няма магчымасьці прыступіць да падрыхтоўкі машыністаў, каб навучыць іх кіраваць машынамі гэтага тыпу.

Між тым, аказваецца, што лёнацерабілкі можна прывесьці на конях, не чакаючы таго часу, калі будзе адрамантаваны мост. Лепельская МТС і райкалгассаюз павінны паклапаціцца аб тым, каб зараз-жа прывесьці са станцыі Вятна лёнацерабілкі.

К.

Пачалася ўборка лёну

Рад МТС пачалі ўборку лёну. Лёзьненская МТС убрала 22 га, Церахаўская — 20 га, Смалявіцкая — 32 га. Праз некалькі дзён уключаюцца ва ўборку лёну амаль усе МТС БССР.

Яшчэ не праполат лён у калгасах „Зьмена“ і „Курганы“

Праполка лёну ў Нова-Максімавіцкім сельсавеце, Клічаўскага раёну, па некаторых калгасах яшчэ да гэтага часу не распачата. Такія калгасы як «Зьмена», «Курганы» яшчэ не ўзяліся за поліва лёну. У калгасе «Зьмена» ёсьць каля 3-х га лёну, але ён вельмі заглушаны пустазельлем.

Камсамол на поліва лёну глядзіць як на другарадную справу. Кіраўніцтва калгасу таксама ня дбае аб праполцы лёну.

— Навошта яго цяпер палоць,—кажуць у калгасе,—выпалецца тады, як будзем убіраць.

Зрыўшчыкам праполкі лёну трэба даць па руках і прымусіць зараз-жа прапалоць лён. Райкалгассаюз павінен прасачыць за гэтым.

Рубашны А.

Даць матар'ялы для заканчэньня перабудовы лёназаводу

ДУБРОЎНА, 1-VIII. (БелТА). Будаўнічая частка работ Дубровенскага лёназаводу будзе скончана раней тэрміну на 1 месяц; 1 кастрычніка ,замест 1 лістапада. З 1 жніўня можна будзе прыступіць да мантажных работ. Да гэтага часу яшчэ не даслана ні адна машына, а таксама невядома, калі яны будуць дасланы.

Будаўнічым матэрыялам завод забясьпечаны, але не хапае 20 скрынак цьвікоў. Адсутнасьць гэтых матэрыялаў і абсталяваньня ставіць пад пагрозу своячасовае заканчэньне і пуск заводу.

Сьвіславіцкі РКС не дапамагае будаўніцтву

Па Сьвіслацкім раёне заключана 14 дагавораў з калгасамі па арганізацыі сьвінагадоўчых таварных фэрмаў і 2 дагаворы на малочныя фэрмы. Аднак, ня гледзячы на гэта, арганізацыя фэрмаў, асабліва ўкамплектаваньне іх, зусім не вядзецца. Райкалгассаюз і РВК не зварочваюць ніякай увагі на гэтую справу, ня гледзячы на тое, што да 1-га жніўня сьвінагадоўчыя фэрмы павінны быць укамплектаваны на 100 проц., а малочныя на 75 проц. Сьвіматкі і каровы, патрэбныя для ўкамплектаваньня фэрмаў, не паступаюць.

Дрэнна абстаіць справа з будаўніцтвам сьвінарнікаў і кароўнікаў. У малочных фэрмах пачалося будаўніцтва кароўнікаў, але вядзецца яно вельмі марудна. Яшчэ горш праходзіць будаўніцтва сьвінарнікаў: з 14 сьвінарнікаў намечаных па пляну, будуецца толькі 7.

У райкалгассаюзе ўсё пацяшаюць: «Справімся яшчэ». Калі-ж па гэтым пытаньні зварочваюцца да старшыні РВК, дык апошні адказвае: «Гэта спра ва не датычыцца РВК».

В. Вясёлы.

Чырвонымі абозамі ідзе новы ўраджай

Першыя сыгналы аб прыёмцы збожжа трывожныя. Церахоўскія загатоўцы прымушаюць чакаць на іх чырвонаабозных здатчыкаў па 3 гадзіны. У Бабруйску яшчэ не гатовы да прыёмкі збожжа

Дзень 1 жніўня калгасы Жлобіншчыны адзначаюць

датэрміновай здачай хлеба дзяржаве чырвонымі абозамі

(Па тэлеграфу ад нашага кар.)

У адказ інтэрвэнтам 1-га жніўня з калгасаў Жлобіншчыны прыбылі чырвоныя абозы новага хлеба

250 фурманак прывезьлі 100 тон жыта.

На месцы здачы арганізаван мітынг з удзелам рабочых арганізацый.

Калгасьнікі запэўнілі, што яны здадуць збожжазагатоўкі раней тэрміну.

Самаль.

Бабруйшчына яшчэ не падрыхтавалася да прыёмкі збожжа

Ніякай літасьці зрыўшчыкам

БАБРУЙСК (**Наш кар.**). Пастанова ЦК УсеКП(б) аб хлебазагатоўках павінна была прымусіць хлебазагатоўчыя і іншыя зьвязаныя з гэтай работай арганізацыі пераключыцца на хуткае разгортваньне падрыхтоўкі да збожжазагатоўчай кампаніі і асеньня-зімніх перавозак.

На справе-ж мы маем у гэтай галіне самае ганебнае злачынае адставаньне. Аддзяленьне Саюзхлебу яшчэ і да гэтага часу ня мае ніякага пляну работы. З боку Наркамснабу ў гэтым напрамку да гэтага часу няма ніякіх дырэктыў і, ня маючы кантрольных лічбаў з цэнтру, мясцовае аддзяленьне Саюзхлебу спакойна чакае іх, ня прымаючы ніякіх мер да складаньня пляну.

У складах, якія мае ў сваім распараджэньні аддзяленьне Саюзхлебу, яшчэ і да гэтага часу ня зроблена дэзынфэкцыя. Надзвычайна марудна аслабяняюцца складзкія памяшканьні для збожжа.

Вельмі востра стаіць пытаньне з забясьпячэньнем загатоўчай кампаніі рабочай сілай для пагрузачна-разгрузачных работ. Паміж Саюзхлебам, Саюзтрансам і адміністрацыяй чыгункі на працягу доўгага часу ідуць спрэчкі аб тым, хто павінен займацца разгрузкавыгрузачнымі работамі і хто павінен турбавацца аб рабочай сіле. У выніку ніводная з гэтых арганізацый нічога ня робіць, вярбоўкі рабочых не вядзецца. Аддзяленьне Саюзхлеба мяркуе арганізаваць арцель грузчыкаў, набраўшы людзей у падпяфным калгасе, але пакуль што гэта застаецца меркаваньнем.

З мэханізацыяй выгрузачных работ справа абстаіць надзвычайна кепска. Аддзяленьне Саюзхлебу мае ў сваім распараджэньні трэнспарцёр, але гэты трэнспарцёр ня можа быць скарыстаны —у яго не хапае частак. Стаіць гэты трэнспарцёр пад адкрытым небам і наўрад ці будзе скарыстаны ў надыходзячую збожжазагатоўчую кампанію, бо арганізацыя, якая прыслала яго (Саюзхлеб), ня турбуецца аб яго скарыстаньні. Ня прымаецца належных мер да таго, каб яго пусьціць у рух, мясновым аддзяленьнем Саюзхлеба.

Надзвычайна дрэнна справа з рэмонтам і пабудовай падвозных чыгуначных шляхоў да складаў. Летась з прычыны позьняга пачынаньня гэтай работы шляхі будаваліся насьпех, дачасу. Сёлета яны патрабуюць значнага рэмонту. Апрача таго патрэбна пабудаваць яшчэ рад шляхоў. Будаўніцтва іх ідзе надзвычайна марудным, чарапашым тэмпамі. З 5-ці чыгуначных пад'язных шляхоў адрамантаваны пакуль што адзін. Да пабудовы новых зусім ня прыступалі.

Склады Саюзхлеба ня маюць унутранага асьвятленьня. Некаторыя з іх нават ня маюць і надворнага асьвятленьня. А гэта, пры начных разгрузачных работах, значна адаб'ецца на пасьпяховасьці працы.

Ня чыгунцы яшчэ да гэтага часу не адрамантаваны пакгаўзы, слаба ідзе арганізацыя транспарту.

Усё гэта сьведчыць аб простай пагрозе зрыву асеньня зімовых перавозак і прыёму паступаючага збожжа, калі ня будуць прыняты рашучыя меры па зьнічэньні паказаных недахопаў і прарываў.



Склады аддзяленьня Саюзхлеба ў Бабруйску да прыёмкі збожжа не падрыхтаваны, падвозная чыгунка не адрамантавана.

Тых, хто да гэтага часу так лёгка адносіўся да падрыхтоўкі да збожжазагатовак і асеньня-зімовых перавозак трэба прыцягнуць да суровай адказнасьці.

А. Забалотны.

Чырвоныя абозы збожжа прастаялі ў Церахоўцы 3 гадзіны

Моцна ўдарыць па ачкаўціраньні загатоўчых арганізацый

Церахоўка. 26-га ліпеня на ст. Церахаўка прыбылі чырвоныя абозы збожжа з калгасу Церахаўка і з двох калгасаў Грабаўскага сельсавету. Абозы прымушаны былі прастаяць 3 гадзіны, пакуль загатоўчыя арганізацыі надумаліся прыняць збожжа і то толькі пасьля таго, як калгасьнікі зьвярнуліся ў РайКК-РСІ.

Загатоўчыя арганізацыі не падрыхтаваліся як сьлед да загатовак і займаліся ачкаўціраньнем перад райкомам КП(б)Б і РВК, запэўняючы іх у поўнай сваёй падрыхтаванасьці. Да гэтага часу не было нават атрымана правільная вага.

Нельга дапусьціць эрыву збожжазагатовак з-за непадрыхтаванасьці загатоўчых арганізацый.

Ачкаўціраньню павінен быць пакладзен канец. Вінаватыя павінны быць прыцягнуты да адказнасьці.

Бярэце прыклад з калгасаў „Шлях Леніна“ і „імя Войкава, якія першымі здалі сена

Ліпнёўскі плян сеназагатовак па раёне перавыканан

Па Чырвона-Слабодзкім раёне пачалася загатоўка сена. Першымі па здачы сена ідуць калгасы «Шлях Леніна» і імя Войкава, якія зьявіліся перадавікамі, уключыўшыся ў загатоўчую кампанію. Прыклад гэтых калгасаў павінен быць пераняты ўсімі астатнімі калгасамі, а таксама і аднаасобнікамі.

Дзякуючы добра разгорнутай рабоце па загатоўках, заданьне па загатоўцы сена ў раёне на ліпень месяц 1931 г. выканана на 102 проц.

Зьдзельшчына падвышае прадукцыйнасьць працы

СЛУЦАК. (Нар. кар.) Калгас «Камбайн» скончыў уборку ячменю і ўжо канчае ўборку жыта. Калгас цалкам пераведзены на зьдзельшчыну. У часе работы паміж брыгадамі і паасобнымі членамі калгасу быў шырока разгорнута ўдарніцтва і сацпаборніцтва. З гэтае прычыны нормы выпрацоўкі знач на перавыконваліся. Зараз калгас прыступіў да ўборкі лёну і пачаў рыхтавацца да асеньняй сяўбы.

Ал. К.

Калгас „Іскра“ скончыў уборку азімых, прыступіў да малацьбы

(ПА ТЭЛЕФ. АД НАШАГА КАРЭСПАНДЭНТА)

Яўрэйскі калгас «Іскра», Шклоўскага раёну, 31-га ліпеня скончыў уборку азімых пасеваў. Ударныя брыгады працавалі па-ўдарнаму 5 дзён з трактарам, жнярнай і снапавязалкай. Убрана 40 га азіміны.

1-га жніўня прыступілі да абмалоту на полі складаной малатарняй.

Шумілаў.

Паскорыць тэмпы налічэньня і збору сельгасподатку

У гэтым годзе, дзякуючы разгортваньню сацыялістычнага будаўніцтва, не мала сялян працавала на пабочных заработках. Між тым, па некаторых раёнах ёсьць памяншэньне неземляробчых заработкаў супроць леташняга году (Мсьціслаўскі—на 24,4 проц., Талочынскі—на 7,1 проц., Жураўльскі—на 3,2 проц. і інш.). Па некаторых раёнах павялічэньне заробку супроць леташняга складае зусім нязначны процант, што таксама трэба расцэньваць, як буйны недаўлік (Гарэцкі—0,4 проц., Круглянскі—4,2 проц., Чырвона-Слабодзкі —2 проц., Ветрынскі—1,1 проц.). Па значнай колькасьці раёнаў недапушчальна дрэнна выяўляюцца гаспадаркі з каньюнктурнымі даходамі (Азарыцкі, Грэскі, Бярэзінскі, Капыльскі, Крупскі, Мсьціслаўскі, Парыцкі, Церахоўскі і інш.). Яшчэ горш ганебна не выяўляюцца кулацкія гаспадаркі для іх абкладаньня ў індывідуальным парадку. Паўтараюцца леташнія агідныя факты, калі ў час вучоту не былі зусім выяўлены кулацкія гаспадаркі (Ветрынскі, Плешчаніцкі, Заслаўскі, Вецебскі, Клімавіцкі; Круглянскі і інш. раёнаў). Аб чым сьведчаць гэтая ганебнейшыя дапушчаныя недахопы? Яны сьведчаць аб тым, што асобныя райарганізацыі (РВК, РПС, Райфо) не прыдалі гэтай палітычнай кампаніі належнага значэньня, не мабілізавалі грамадзкасьць вакол гэтай кампаніі, праяўленьне праваапартуністычнай практыкі і давялі да дапушчэньня такіх палітычных недахопаў у гэтай кампаніі.

Між іншым, Сароцінскі фінансавы апарат паказаў лепшы прыклад работы ў гэтай кампаніі. Ён скончыў налічэньне падатку і ўручыў платнікам акладныя лісты 10-га ліпеня, арганізаваў брыгаду з 3-х работнікаў і ўзяў на буксір адстаючы Вульскі раён.

Аднак папярэднія вынікі кампаніі па сельгаспадатку і страхоўцы сьведчаць аб тым, што тэмпы, узятыя месцамі ў рабоце па сельгаспадатку і страхоўцы ні ў якай ступені ня могуць лічыцца здавальняючымі. Пасьпяховасьць правядзеньня кампаніі сельгаспадатку і страхоўкі можа быць забясьпечана толькі ў тым выпадку, калі ўсе райарганізацыі мабілізуюць грамадзкасьць вакол гэтай кампаніі і палітычна правіль на будуць праводзіць ўсе гэтыя мерапрыемствы... Аднак, гэтай чоткасьці на жаль, яшчэ не хапае.

Трэба адзначыць, што сельгаспадатак і страхоўка займае даволі значнае месца ў выкананьні 3-га кварталу і павінна даць 8,500 тыс. сельгаспадатку і 9,500 тысяч страхоўкі. Ясна, што выканаць гэта заданьне магчыма толькі пры ўмове разгортваньня кампаніі бальшавіцкімі тэмпамі. Вакол датэрміновай ўплаты сельгаспадатку і страхоўкі, павінна быць разгарнута масавая работа пры шырокім ўдзеле грамадзкасьці і пры скарыстаньні сацпаборніцтва, ударніцтва, грамадзкага буксіра і г. д.

Ня малую ролю ў сельска-гаспадарча-падатковай і страховачнай кампаніі павінны адыграць прафсаюзныя арганізацыі і ўся прафсаюзная маса. Асабліва адказная ў гэтай кампаніі роля выпадае Саюзу Фін. Банкаўскіх работнікаў. ЦП Саюзу Фін. Банкаўскіх работнікаў распрацавала канкрэтныя мераприемствы па гэтым пытаньні і разаслала па ўсіх РМК. Аднак, паведамленьні з месц сыгналізуюць аб недастатковым ўдзеле ў гэтай кампаніі фін. банкаўскіх работнікаў. Задача цяпер-ўся ляк дапамагчы актывізацыі грамадзкамасавай работы фін. органаў, асабліва ў сельскіх саветах і на вёсцы.

Гэраўкер.

4-ы ўсебеларускі зьезд Белсамправмкаапэрацыі

28-VII-31 г. У Менску пачаў працаваць IV Усебеларускі зьезд Белсамправмкаапэрацыі.

Зьезд праходзіць пры вялікай актыўнасьці дэлегатаў. Усе дэлегаты актыўна выслухоўваюць даклады кіруючых органаў, з тым, каб пасьля разгарнуць спрэчкі ў напрамку канкрэтнай самакрытыкі, у напрамку канкрэтных прапаноў.

На першым пасяджаньні зьезд вітаў намесьнік старшыні Савету Народных Камісараў БССР тав. Бэнэн. У гэты вечар Гомельская дэлегацыя, вітаючы зьезд перадала зьезду ад гомельскіх пралетарыеў сьцяг. Таксама ў часе першага пасяджаньня зьездам былі разданы лыплёмы і ганаровыя лісты тым арцелям, якія вызначыліся на Усебеларускай сельска-гаспадарчай і прамысловай выстаўцы мінулага году.

29-VII-31 г. зьезд віталі бабруйскія фізкультурнікі і рабочыя ад Ратускай тарфяной арцелі. Пасьля прывітаньняў зьезд заслухаў даклад нам. старшыні праўленьня Усесаюзнай прамысловай каапэрацыі «аб дзейнасьці сыстэмы прамкапэрацыі і далейшых задачах».

30-VII-31 г. Зьезд слухаў даклад старшыні праўленьня Белсамправмкаапэрацыі тав. Брыскіна. Тав. Брыскін, робячы даклад аб сыстэме Белсамправмкаапэрацыі, спыніўся на становішчы выкананьня прамфінпляну, на выкананьне дырэктыў вышэйшых органаў аб пераводзе вытворчасьці Белсамправмкаапэрацыі на мясцовую сыравіну. Далей дакладчык завастрыў увагу зьезду. на больш рашучае разгортваньне сыстэмы прамкаапэрацыі на вёсцы, на ўцягненьне ў працу прамкаапэрацыі жанчын, моладзі, што зараз не займае належнага месца і г. д.

Пасьля дакладу т. Брыскіна разгарнуліся спрэчкі, якія працягваліся да вячэрняга пасяджаньня 31 ліпеня.

31-га ліпеня зьезд выслухаў даклад намесьніка старшыні Белсамправмкаапэрацыі тав. Фрыда, які далажыў зьезду аб рэарганізацыі сыстэмы прамкаапэрацыі згодна апошніх пастаноў СНК СССР і СНК БССР.

Па дакладу былі разгорнуты бурныя спрэчкі, адабраючы гэтыя пастановы.

Таксама 31-VII г. г. зьезд заслухаў даклад тав. Шаміра аб кантрольных лічбах на 1932 год.

Койданаўскі райпрамкаапсаюз атрымаў пераходны сьцяг—імя 4-га Усебеларускага зьезду Бежуствправмкаапэрацыі—за лепшае выкананьне прамфінпляну

Рагачэўскаму райпрамсаюзу зьездам вызначана прэмія ў суме 1000 руб. на паляпшэньне культмасавага абслугоўваньня тарфянікаў: за лепшае выкананьне пляну па торфаздабычы.

Зьезд вітала чырвонаармейская дэлегацыя ад Астраханскага кав. палка. Дэлегацыя запэўніла зьезд, што Астраханскі кавполк, як уся РСЧА, моцна стаіць і будзе стаяць на ахове межаў пралетарскай дзяржавы.

3-га жніўня будуць працаваць сэкцыі па складаньню канкрэтных прапаноў па ўсіх пытаньнях зьезду. У гэты-ж дзень адбудуцца выбары кіруючых органаў.

М.

Выступленьне на IV усебеларускім зьезьдзе Белсамправмкаапэрацыі тав. ГЕЯ

На вячэрнім пасяджаньні IV ўсебеларускага зьезду Белсамправмкаапэрацыі ўчора з вялікай прывітальнай грамовай выступіў першы сакратар ЦК КП(б)Б тав. Гей.

Тав. Гей у сваёй прамове асабліва падкрэсьліў прарывы і значнае недавыкананьне прамфінпляну Белсамправмкаапэрацыі і вызначыў рад канкрэтных задач у яе далейшай рабоце.

Дэлегаты зьезду бурнай авацыяй спаткалі прамову тав. Гея.

(Прамова тав. Гея будзе зьмешчана ў бліжэйшым нумары нашай газэты).

Пастановы партыі і ўраду аб перабудове работы каапэрацыі не рэалізуюцца

Н.-Барысаў, 30-VII. (Белта). Перабудова работы каапэрацыі ў адпавед насьці з запатрабаваньнямі тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва мае вялікае значэньне, а Бярэзінскім ЗРК у ажыцьцяўленьне пастановы ЦК КП (б)Б і СНК БССР нічога ня зроблена. Бярэзінскі ЗРК абмежаваўся правядзеньнем сходу, на якім прысутнічала каля 200 рабочых з агульнай колькасьці пайнікаў звыш 3 тыс., і на гэтым супакоіліся.

У рабоце ЗРК панує поўны самацёк і абязьлічка, адсутнічае апэрацыйнае кіраўніцтва закрытымі разьмеркавальнікамі і сталовай, таму работа сталовай вельмі дрэнная. Неадзінкавыя выпадкі псаваньня прадуктаў і пакражы. Між тым праўленьне ЗРК слаба рэагуе на гэтую крымінальшчыну.

Працдысцыпліна слабая. Паміж загадчыкамі і афіцыянтамі панує сямейственасьць, вынікам чаго зьяўляецца заняпад працоўнай дысцыпліны.

Работа закрытых разьмеркавальнікаў не прыстасавана да абслугоўваньня рабочых, таму заўсёды стаяць вялікія чаргі. Праўленьне ЗРК гэтым пытаньнем не займаецца. Ва ўсёй сыстэме ЗРК адсутнічае сацпаборніцтва і ўдарніцтва.

З мэтаю лепш наладзіць забесьпячэньне рабочага спажыўца малочнымі прадуктамі

рэдакцыя газэты „Савецкая Беларусь“

СКЛІКАЕ 5-га ЖНІЎНЯ А 7-Й ГАДЗІНЕ ЎВЕЧАРЫ (ПЛЯЦ ВОЛІ, 17) НАРАДУ

На нараду дня стаяць пытаньні: 1) аб ходзе загатовак малочных прадуктаў і 2) аб мерапрыемствах для палепшаньня арганізацыі малочнай справы

На нараду запрашаюцца прадстаўнікі Наркамзему (Маслатрэст), Наркамснабу, НК аховы здароўя і яго ўстаноў (больніцы, дзіцячыя ясьлі, сады, сан. кір.), РСІ, Белкантры Саюзмалака, Белмалакасаюзу, Белсаўгастрэсту, Малакацэнтру (пры Калгасцэнтры), Белхлебжывёлсаюзу, Малказаводу, цэнтральнай малочнай лябараторыі, Халадзільніку, дзяржаўнай інспэкцыі па якасьці, каапкамісіі заводаў „Камунар“ і імя Варашылава, упа наважаны НК Шляхаў і брыгадзіры-рабочыя заводу імя Варашылава, т. т. Раханскі, Апарын, Маўшо іч.

Удзельнікі нарады павінны мець канкрэтныя матар'ялы аб становішчы малочнай справы і свае прапановы аб неабходных мерапрыемствах.

Просьба зьявіцца без спазьненьня

РЭДАКЦЫЯ

Агляд друку

„Калгасная Праўда“ Лепельскі раён

У барацьбу за лён і канаплі

„Прымежны Калгасьнік“, Вушацкі раён

БССР у гэтым годзе дамаглася вялізарнейшых посьпехаў у галіне пасеву лёну і канапель. Плошча пасеву лёну узрасла ад 150.000 га у мінулым годзе да 240.000 у гэтым годзе. Большасьць партарганізацый і раённых газэт сталі на чале барацьбы за сяўбу тэхкультур, здолелі мабілізаваць шырокія масы калгасьнікаў, беднякоў і серадняковаў вакол гэтай важнейшай політычнай задачы.

Зараз перад намі стаіць ня менш адказная задача—трэба ў найкарацейшы тэрмін прыбраць і апрацаваць лён каб найхутчэй здаць яго нашай сацпрамысловасьці. У справе ажыцьцяўленьня гэтай задачы вялізарную ролю павінны адыграць нашы раённыя газэты, якім неабходна своячасова завастрыць грамадзкую думку, мабілізаваць увагу найшырэйшых калгасных і аднаасобных бядняцка-серадняцкіх мас на выкананьне гэтай задачы.

Гэта патрабуе ад нашага раённага друку павялічанай увагі, бальшавіцкай пільнасьці і ўпартасьці, уменьня мабілізаваць масы на выкананьне пляну лёнаўборкі, па барацьбу з клясавым ворагам кулаком, правымі і «левымі» апартуністамі.

***

Лепельская раённая партарганізацыя па бальшавіцку справілася з вясновай сяўбой. Плян пасеву лёну перавыкананы, замест 4926 га лёну, пасеяна 4134 га, што складае 121,5 проц. заданьня. На орган Лепельскага РК КП(б) «Калгасная Праўда», як і на ўсю партарганізацыю Лепельшчыны зараз ускладаюцца вельмі адказныя задачы па арганізацыі своячасовай уборкі і апрацоўкі лёну і канапель.

Перад намі камплект «Калгаснай Праўды» за ліпень. З ліпеня газэта зьмяшчае на першай старонцы артыкул «Па бальшавіцку разгарнуць праполачную кампанію», дзе між іншым піша:

«... Праполачная кампанія ў самым разгары, а па раёне вытварана полка лёну на плошчы 285 га. Лічба неадпавальняючая. **Частка калгасаў ганебна адстаюць, імі не праполата ніводнага га пасеву»** (падкрэсьлена намі—Рэд.).

Якія-ж гэта калгасы ганебна адстаюць па праполцы? Газэта іх не называе, **не выкрывае тых апартуністаў, што не клапоцяцца аб поліве лёну.** Такім чынам, «Калгасная Праўда» **абязьлічвае сваю крытыку** і робіць бескарысны, халасты стрэл.

У наступным нумары, 9-га ліпеня, «Калгасная Праўда» зьмяшчае пастанову НКЗ аб уборцы лёну і канапель. без усякіх камэнтараў. Ніводнага допісу аб тым, як ідзе па раёне праполка і падрыхтоўка да ўборкі тэхкультур газэта не зьмяшчае.

16-га ліпеня, даючы цэлую старонку прысьвечаную падрыхтоўцы да ўборкі, пад агульнай назвай: «Рашучы агонь па апартуністах зрываючых падрыхтоўку да ўборачнай»,—газэта ўму дрылася эноў такі не зьмясьціць ніводнага допісу аб ходзе поліва і падрыхтоўцы да ўборкі тэхнічных культур. «Будзем змагацца за ўборачную, як змагаліся за веснавую сяўбу», заклікае газэта ў нумары ад 22 ліпеня, але і ў гэтым нумары ні слова не ўспамінае аб падрыхтоўцы да ўборкі лёну і канапель.

Толькі 29-га ліпеня газэта ўспамінае аб лёне. Яна зьмяшчае на апошняй старонцы артыкул агульнага характару «Сустрэць у баявой гатоўнасьці ўборку тэхкультур»,, дзе між іншым піша:

—«посьпех уборкі будзе залежаць выключна ад таго, наколькі грамадзкія і партыйныя арганізацыі здолеюць мабілізаваць калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкія масы, узьняць іх творчую ініцыятыву».

«Калгасная Праўда» сама ня здолела мабілізаваць калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкія масы вакол уборкі лёну і пайшла па лініі, самацёку. Газэта неадацэньвае барацьбы за тэхкультуры, не разумее сваёй ролі як газэты лёнаводнага раёну.

***

Орган Вушацкага райкому КП(б)Б «Прымежны Калгасьнік» ня дрэнна правёў барацьбу за сяўбу тэхкультур, якіх засеяна 113 проц. у адносінах да пляну. Але пытаньне падрыхтоўкі да ўборкі і поліва лёну амаль выпала з пад увагі газэты.

Дабіўшыся перамогі на фронце сяўбы, газэта «почила на лаврах». Яна не разгарнула належнай кампаніі за даглядам засеянага лёну, за полівам яго і падрыхтоўкай да ўборкі.

За ўвесь ліпень месяц зьмешчан усяго... 1 допіс, аб даглядзе засеяных тэхкультур і зусім няма матэрыялаў аб тым, як ідзе падрыхтоўка да ўборкі лёну.

Праўда, на працягу месяца газэта зьмясьціла два перадавыя артыкулы аб падрыхтоўцы да ўборкі лёну, але толькі агульнага характару без асьвятленьня таго, што робіцца на мясцох.

«Пастанова Райвыканкому аб праполцы тэхкультур калгасамі і сельсаветамі ня выканана. **Праполка тэхкультур павінна стаць у цэнтры ўвагі ўсіх калгасаў і грамадзкасьці раёну** побач з разгортваньнем бальшавіцкіх тэмпаў усёй уборачнай кампаніі». Так піша «Прымежны Калгасьнік» 23 ліпеня.

Нажаль гэта пытаньне яшчэ ня стала як сьлед «у цэнтры ўвагі» самой газэты. Яна ня выкрыла тыя сельсаветы і калгасы, якімі пастанова Райвыканкому аб праполцы тэхкультур ня выканана, не асьвятліла вопыту тых калгасаў што справіліся з праполкай тэхкультур і г. д.

***

Усім раённым газэтам трэба памятаць, што толькі там, дзе газэта мабілізуе рабселькораўскія масы, дзе яна зьяўляецца «ня толькі прапагандыстам агітатарам, але і калектыўным арганізатарам»,—правадыром грамадзкай думкі,—мы будзем мець посьпехі і бальшавіцкія тэмпы ў працы.

Гэтых якасьцяй яшчэ няма ў «Калгаснай Праўды» і «Прымежнага Калгасьніка» асабліва па пытаньні ўборкі тэхкультур. Трэба неадкладна зьнішчыць апартуністычную недаацэнку лёнаўборкі, мабілізаваць вакол яе ўвагу шырокіх калгасных, бядняцка-серадняцкіх і рабселькораўскіх мас, даць бязьлітасны бой кулаку і яго агентуры—правым і «левым» апартуністам, якія спрабуюць затармазіць і сарваць уборку тэхнічных культур.

Брыгада НКФ сыгналізуе

Упаўнаважаныя Мсьціслаўскага РВК не адчуваюць адказнасьці за рэалізацыю пазыкі

Асноўнымі прычынамі зрыву дэкадніка рэалізацыі пазыкі па Мсьціслаўскім раёне зьяўляюцца безадказныя адносіны да рэалізацыі пазыкі з боку ўпаўнаважаных РК і РВК, а таксама і слабая работа сельсаветаў, недастатковая работа фінапарату і адсутнасьць належнага кантролю за выкананьнем сваіх дырэктыў з боку кіруючых арганізацый.

За адсутнасьцю зьвестак нельга ўстанавіць слабыя вучасткі для таго, каб даць дапамогу. Ход кампаніі па раёне нідзе не асьвятляецца. Райкамол маючы насьценгазэту ня выпусьціў ніводнага нумару прысьвечанага пазыцы.

Пры прыезьдзе брыгады ў Мазалаўскі сельсавет на сходзе актыву, пытаньне аб рэалізацыі пазыкі сакратар парт'ячэйкі т. Новікаў прапанаваў аднесьці ў бягучыя справы і толькі ў сувязі з выступленьнем брыгады яго разглядвалі трэцім на парадку.

У Татарчынскім сельсавеце ўпаўнаважаны тав. Жукоўскі шукае сваіх брыгадзіраў, а брыгадзіры знаходзяцца бяз усякага кіраўніцтва. У Рылаўшчынскім сельсавеце старшыня і сакратар парт'ячэйкі, на прапанову ўпаўнаважанага РВК склікаць нараду актыву па пытаньні рэалізацыі пазыкі, адмовіліся зрабіць нараду, матывіруючы тым, што ў сучасны момант праходзіць уборка.

Рэалізацыя пазыкі сярод аднаасобнікаў яшчэ не пачата. Усяго пазыкі ў гэтым сэктары рэалізавана на некалькі сот рублёў, у той час калі патрэбна рэалізаваць каля 100.000 руб. Сыстэма камсодаў у працы ніякага ўдзелу ня прымае і бязьдзейнічае. Прафсаюзамі былі пасланы брыгады на вёску ў дапамогу сельсаветам, але-ж належнага кантролю за іх работай з боку мясцкому ня было.

Толькі пры мабілізацыі ўсіх сіл, перакіданьні іх на вёску і ўстанаўленьне чоткага кантролю з боку кіруючых арганізацый за працай упаўнаважаных, сельсаветаў і брыгад магчыма ў найкарацейшы тэрмін ліквідаваць прарыў.

Брыгадзір НКФ Электразаводу і «Савецкай Беларусі»

БАЎМГОЛЬЦ.

Бярэце прыклад з калгасаў 1-га мая, імя Сталіна і імя „Правды“

28-VII у Талочыне адбыўся зьлёт камісій садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчадкасьці справе сельсаветаў і калгасаў. Зьлёт заслухаў даклад кіраўніка раённага банку тав. Розенблата аб выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў і рэалізацыі пазыкі «3-ці рашаючы», зьлёт склікан па ініцыятыве раённай камісіі, які пастанавіў прэміраваць камсоды пры калгасе імя тав. Сталіна і камсод пры калгасе імя «Правды», якія перавыканалі лічбу на падпісцы на пазыку.

На зьлёце прэміравана камісія Сакольніцкага сельсавету, які выканаў сваю кантрольную лічбу на 100 проц. Камсод першага калгасу імя Сталіна прэміраваны на 200 руб., імя «Правды» на 100 руб. і камсод сельсавету на 100 руб.

Сакольніцкая камісія выклікала на спаборніцтва ўсе камсоды раёну. Прысутнічаўшыя на зьлёце камсоды ўзялі на сябе абавязак скончыць рэалізацыю пазыкі як сярод калгасьнікаў так і аднаасобнікаў да 1-га жніўня.

Брыгадзір НКФ, Электразаводу і «Савецкай Беларусі»

Вольпава.

Тэрмін рэалізацыі пазыкі канчаецца,

а падпіска ў вёсцы праходзіць недапушчальна марудна

Камсод Бавальскага сельсавету бязьдзейнічае. Сакратар Мазалаўскай парт'ячэйкі Новікаў рэалізацыю пазыкі лічыць другараднай справай

Мясцовыя фарсыраваць тэмпы рэалізацыі пазыкі, раўняцца па калгасах „1 мая“, імя Сталіна і „Правды“, якія прэміраваны за 100 проц. выкананьне сваіх заданьняў

Лоеўскі раён цягнецца ў хвасьце

Па ўсім Лоеўскім раёне патрэбна распаўсюдзіць пазыкі «Трэцяга рашаючага» на суму 222 тысячы руб., у тым ліку сярод рабочых і служачых на 44 тыс. руб.

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра дапаўненьне Грамадзянскага Працэсуальнага Кодэксу артыкулам 21-б і пра зьмену артыкулаў 103 і 300 гэтага кодэксу

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляюць:**

1. Дапоўніць Грамадзянскі Працэсуальны Кодэкс БССР артыкулам 21-б у наступнай рэдакцыі:

«Арт. 21-б. Спрэчкі па заключаных дагаворах і ўгодах і іншыя маемасныя спрэчкі паміж установамі, прадпрыемствамі і арганізацыямі аграмаджанага сэктару вырашаюцца ў парадку дзяржаўнага арбітражу на падставе правіл «Палажэньня пра дзяржаўны арбітраж» (З.З. СССР 1931 г., № 26, арт. 203), апроч наступных спраў, якія павінны разглядацца ў народным судзе:

а) спрэчак па апярацыях Дзяржаўнага Банку, калі Дзяржаўны Банк зьяўляецца стараною ў справе;

б) спрэчак па дагаворах аб карыстаньні камунальнымі паслугамі;

в) спрэчак, што вынікаюць з дагавораў, чугуначнай перавозкі;

г) спрэчак на суму менш 5.000 руб. паміж установамі, прадпрыемствамі і арганізацыямі аграмаджанага сэктару, у якіх стараною зьяўляецца цэнтральны орган Саюзу ССР альбо цэнтральны орган прадпрыемства агульна-саюзнага значэньня;

д) спрэчак паміж іншымі установамі, прадпрыемствамі і арганізацыямі аграмаджанага сэктару на суму менш 3.000 руб.

Спрэчкі, паказаныя у п. «г» і «д» гэтага артыкулу разглядаюцца Вярхоўным судом (п. «а» арт. 24), калі адказчыкам зьяўляецца агульнасаюзны альбо рэспубліканскі цэнтральны орган і калі няма спэцыяльнай пастановы Вярхоўнага Суда пра перадачу справы на вырашэньне народнага суда.

Пры разглядзе спраў, паказаных у п. «г» і «д» гэтага артыкулу, народнымі заседацелямі ўдзельнічаюць прадстаўнікі мясцовых гаспадарак ўстаноў і прадпрыемстваў, якія вылучаюцца адпаведнымі раённымі выканаўчымі камітэтамі альбо гарадзкімі саветамі па прапанове суда».

2. У пункце «г» арт. 103 Грамадзянскага Працэсуальнага Кодэксу выключыць словы: «арбітражнай камісіі, зямельнай камісіі і інш.».

3. Пункт «е» арт. 300 Грамадзянскага Працэсуальнага Кодэксу запісаць у наступнай рэдакцыі:

«е) пастановы Дзяржаўнага арбітражу і пасрэдніцкіх судоў».

Ч. в. аб. Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. Гнілякевіч.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **К. Бэнэк.**

За Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **Б. Вансоўскі.**

25 ліпеня 1931 г.
гор. Менск.

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народых Камісараў БССР пра пасьведчаньні асобы

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляюць:**

1. Пасьведчаньні асобы выдаюцца органамі міліцыі.

2. Пасьведчаньні асобы выдаюцца на неабмежаваны тэрмін.

3. Інструкцыя пра ўжываньне гэтай пастановы выдаецца Галоўным Кіраўніцтвам Міліцыі і Крымінальнага Вышуку пры СНК БССР.

4. З часу выданьня гэтай пастановы касуецца пастанова ЦВК і СНК БССР за 2-II—1928 г. «Пра пасьведчаньні асобы» (З. З. БССР 1928 г., № 9, арт. 69)

Ч. в. аб. Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. Гнілякевіч.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **К. Бэнэк.**

За Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
Б. Вансоўскі.

25 ліпеня 1931 г.
г. Менск.

Пастанова Народнага Камісара Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі БССР

Ад 28-VIII—31 г.

Аб арганізацыі Беларускага аб'яднаньня па камунальнаму і непрамысловаму будаўніцтву «Белкамунбуд», згодна пастановы СНК БССР ад 18-IV—1931 году.

1. Прадстаўленую на зацьвярджаньне НК РСІ Бел. схэму і структуру апарату Белкамунаб'яднаньня пры ГККГ зацьвердзіць, дзеля арганізацыі гэтага аб'яднаньня існуючы Менскі Будаўнічы Трэст (Менбуд) рэарганізаваць у Беларускае аб'яднаньне па камунальнаму і непрамысловаму будаўніцтву, якому перадаць наяўны штат, маемасьць і сродкі гэтага трэсту.

2. Усе існуючыя на тэрыторыі БССР камунальныя будаўнічыя трэсты з наяўнымі штатамі работнікаў, маемасьцю і сродкамі ўліць у «Белкамунаб'яднаньне».

3. Згадзіцца з арганізацыяй пры «Гіпрагоры» праектнага бюро па камунальнаму і жыльлёваму будаўніцтву, дзеля чаго з арганізацыяй пры ГККГ «Гіпрагора»—перадаць яму ўвесь штат і маемасьць праектнага бюро Белбудканторы пры бюро пры Белбудканторы, абавязаць ГККГ поўнасьцю і своячасова забясьпечваць Белбудканторы неабходным праектовачным матар'ялам па жыльлёваму будаўніцтву.

4. З арганізацыяй «Белкамунбуду»—дзейнасьць Белбудканторы абмежаваць выключна жыльлёвым будаўніцтвам, як новым, так і рамонтам старога.

5. Пастанову апублікаваць у друку.

Нам. Наркома РСІ Бел. **Іваноў.**

Выраж для памяці

Рабочая праграма па ўборцы ўраджаю садоў у калгасах БССР

1. Для пасьпяховага правядзеньня работ па збору ўраджаю садоў у кожным калгасе яшчэ да пачатку ўборачнай кампаніі павінны быць праведзены падрыхтоўчыя работы і складзены апэрацыйныя пляны работ, у якіх прадугледзець:

а) плошчу сада, падлягаючую ўборцы;

б) цьвёрды каляндарны тэрмін пачатку і скончэньня работ па ўборцы і здачы прадукту садоўніцтва;

в) патрэбнасьць у інвэнтары (драбіны, пладаздымнікі, кошыкі і інш.);

г) патрэбнасьць у тары, цягавай і рабочай сіле;

д) патрэбнасьць у балаганах і інш. памяшканьнях, прыстасаваных для хаваньня зьнятых пладоў.

2. Калгас павінен паклапаціцца і паставіць у дастатковай колькасьці падпоры, недапушчаючы ні ў якім разе паломкі дрэў ад ураджаю пладоў.

3. Уся праца на зборы ўраджаю саду павінна праводзіцца выключна зьдзельна і брыгадным мэтадам, пры чым за кожнай брыгадай замацоўваецца вучастак, альбо колькасьць дрэў, ці радкоў саду на пэрыяд работы.

4. За брыгадай, а таксама за кожным колгасьнікам замацоўваецца інвэнтар, пад асабістую адказнасьць брыгадзіраў і брыгады ў цэлым за цэласьць і захаванасьць гэтага інвэнтара на ўвесь час працы.

5. Да пачатку ўборкі садавіны ўсе калгасы павінны дагаварыцца з дзяржаўнымі і кааперацыйнымі нарыхтоўчымі арганізацыямі аб пунктах здачы садавіны, аб забясьпячэньні тарай, аб умовах разьліку і г. д.

Неабходна вышукаць і мабілізаваць усю тару маючуюся на мясцох.

6. Пасьпяховае праведзеньне ўборкі садавіны будзе залежаць ад дакладнага апэрацыйнага кіраўніцтва гэтай работай як з боку Праўленьняў калгасазоваў, а таксама і праўленьняў калгасаў, правільнай арганізацыі працы на аснове сапраўднай зьдзельшчыны і своячасовага ўліку працы ў працадзнёх, шырокага ахопу ўсіх работ па ўборцы сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам.

Ахова ўраджаю

1. Як толькі плады падрастуць, калгас павінен паставіць вартаўніжоў у садзе для аховы ўраджаю.

2. Норма выпрацоўкі па ахове саду пры двух зьменных вартаўніках—6 га.

3. Расцэнка працы па ахове саду робіцца, прыкладна, з разьліку:

а) пры плошчы саду да 6 га—па 25 сотак працадня з га (работа лёгкая);

б) пры плошчы саду да 12 га, па 20 сотак працадня з га (р. л.);

в) пры плошчы саду да 20 га, па 18 сотак працадня з га (р. л.);

г) пры плошчы саду да 24 га, па 15 сотак працадня з га (р. л.).

Збор падаліцы

1. У садзе пад дрэвамі бывае шмат падаліцы (плады пашкоджаныя гніллю, плодажоркай, зьбітыя ветрам і інш.). Падаліцу неабходна зьбіраць і калі яна непрадстаўляе ніякай каштоўнасьці, заражана гніллю і пашкоджана плодажоркай,—зьнішчаць на агні. Больш каштоўную падаліцу, пашкоджаную плодажоркай,—насыпаць у бачкі і заліваць вадою, каб зьнішчыць вусьня плодажоркі, які знаходзіцца ў сярэдзіне пладоў, пасьля чаго падаліцу можна скарыстаць.

2. Дзённая норма выпрацоўкі па зборы падаліцы на аднаго чалавека устанаўліваецца—5 цэнтнэраў.

3. Расцэнка працы у працадзнёх па зборы падаліцы утвараецца—15 сотак працадня за цэнтнэр. (работа лёгкая).

Здыманьне пладоў

1. Для здыманьня пладоў на плошчы саду ў 10 га, пры ўраджаі, прыкладна ў 4 тоны з га, складаецца брыгада з 20 асоб, якая павінна скончыць здыманьне за 5 дзён.

2. Да пачатку працы брыгадзір вызначае кожнаму калгасьніку плошчу, альбо адпаведную колькасьць дрэў ці радоў саду.

3. Плады асьцярожна здымаюцца і складаюцца ў балаганы, альбо іншыя прыстасованыя памяшканьні, з такім разьлікам, каб іх не пашкодзіць.

4. Зьнятыя плады павінны праляжаць у балаганах, альбо іншых прыстасованых памяшканьнях да сартоўкі іх, прыблізна 8—10 дзён.

5. Дзённая норма выпрацоўкі па здыманьні пладоў і складаньні іх у балаганы устанаўліваецца на аднаго чалавека—4 цэнтнэры.

6. Расцэнка працы па здыманьні пладоў і складаньні іх у балаганы утвараецца з разьліку 25 сотак працадню за цэнтнэр (работа сярэдняя).

Сартоўка і ўпакоўка

1. Для сартоўкі і ўпакоўкі пладоў з плошчы (прыкладна) у 10 га, пры ўраджаі 4 тоны з га, патрэбна брыгада ў 20 асоб, з якіх 8 асоб сартуюць; 10 асоб упакоўваюць у 32 клг. скрынкі і 2 асобы забіваюць скрынкі, маркіруюць і падрыхтоўваюць да адпраўкі. Работа павінна быць скончана у працягу 10-ці дзён.

2. Дзённая норма выпрацоўкі па сартоўцы пладоў устанаўліваецца на адну асобу—5 цэнтнэраў.

3. Расцэнка працы па сартоўцы вытвараецца з разьліку 25 сотак працадня за цэнтнэр (работа кваліфікаваная).

4. Дзённая норма выпрацоўкі па ўпакоўцы пладоў на адну асобу устанаўліваецца 4 цэнтнэры.

5. Расцэнка працы па ўпакоўцы пладоў утвараецца з разьліку 30 сотак працадню за цэнтнэр (работа кваліфікаваная).

6. Дзённая норма выпрацоўкі па забіўцы скрынак на адну асобу устанаўліваецца 60 скрынак.

7. Расцэнка працы па забіўцы скрынак утвараецца з разьліку 25 сотак працадню за 12 скрынак (работа кваліфікаваная).

Возка пладоў

1. Вазіць плады магчыма пасьля скончэньня сартоўкі і ўпакоўкі адразу на некалькіх падводах, асабліва калі плады для адпраўкі пагружаюцца у вагоны.

2. Дзённая норма выпрацоўкі па возцы пладоў з саду з пагрузкай на конную падводу каля 3-х цэнтнэраў і на параконную падводу каля 5 цэнтнэраў пладоў (чыстая вага) устанаўліваецца:

а) пры адлегласьці да 3-х кілёмэтраў—4 абароты; б) пры адлегласьці да 5 клм.—3 абароты; в) да 8 клм.—2 абароты; г) звыш 8 клм. і да 20 клм.—1 абарот.

3. Расцэнка працы па возцы пладоў устанаўліваецца на аднаконнай падводзе: а) пры адлегласьці 3 клм.—8 сотак працадня за цэнтнэр; б) пры адлегласьці 5 клм.—11 сотак працадня за цэнтнэр; в) пры адлегласьці 8 клм.—16 сотак працадня за цэнтнэр; г) звыш 8 клм. і да 20 клм.—33 соткі працадня за цэнтнэр (работа сярэдняя).

На параконнай падводзе: а) пры адлегласьці 3 клм.—5 сотак працадня за цэнтнэр; б) пры адлегласьці 5 клм—7 сотак працадня за цэнтнэр; в) пры адлегласьці 8 клм.—10 сотак працадня за цэнтнэр; г) звыш 8 клм. да 20 клм.—20 сотак працадня за цэнтнэр (работа сярэдняя).

4. Увесь брак і адыход застаецца для перапрацоўкі на сушыльных альбо варачных пунктах.

Уборка падпорак

1. Пасьля ўборкі ўраджаю зьбіраюцца і зносяцца ў адно месца падпоркі.

2. Дзённая норма выпрацоўкі на адну асобу па ўборцы падпорак устанаўліваецца—2000 штук.

3. Расцэнка працы па ўборцы падпорак утвараецца з разьліку 50 сотак працадня за тысячу (работа сярэдняя).

Агульныя тэрміны ўборачнай кампаніі пладоў па БССР устанаўліваюцца: для раньніх пладоў—з 10 жніўня па 1-га верасьня, а для позьніх пладоў—з 1-га верасьня па 1-ае кастрычніка.

За 35—40 кілёмэтраў 11 рублёў

З Магілеву ў мястэчка Бялынічы ходзіць паштовы аўтабус (Магілёўская канторы сувязі). Апроч пошты аўтабус бярэ пасажыраў. Адлегласьць паміж гэтымі пунктамі 34—40 кілемэтраў.

За праезд пасажырам прыходзіцца плаціць па 11 рублёў і за рэчы ад кілё па 30 кап.

Зусім зразумела, што рабочым езьдзіць на гэтым аўтабусе ня прыходзіцца.

Цікава чаму Магілёўская кантора сувязі ўстанавіла такі высокі тарыф?

Магілёўскай РК РСІ патрэбна праверыць, чаму такі высокі тарыф па праезьдзе аўтабусам з Магілёва ў м. Бялынічы.

Я. Канькоў.

Кіно

„Пуцёўка ў жыцьцё"

Праца з дапамогай якой за ўмовах сацыялістычнай арганізацыі вытворчасьці перавыхоўваецца, запоўна нарадзіцца новы сацыялістычны чалавек; пуцёўка ў жыцьцё, якая дасьцца масе бяспрытульных (ды і ня толькі адным бяспрытульным), што пераставаліся ў рабочым катле, атрымалі ў абставінах здаровай сацыялістычнай працы здаровыя працоўныя навыкі, здаровы пагляд на жыцьцё—гэткі асноўны зьмест, асноўная ідэя першага плянамэтражнага савецкага гукавога кіна-фільму, які вось ужо рад дзён ідзе з нязьменным посьпехам на экране кіна-тэатру «Чырвоная Зорка».

Трэба сказаць, што посьпех, якім карыстаецца «Пуцёўка ў жыцьцё» у Менскага гледача зусім заслужаны гэтай гукавой кіна-карцінай. Вельмі добра паказан самы працэс паступовага перараджэньня беспрытульнага ў сьвядомага рабочага, у карыснага члена сацыялістычнай грамады. Вельмі добры, жыцьцёвы, не утрыраваны самыя тыпы бяспрытульных. Асабліва ўдалы ў гэтых адносінах сцэны ў камісіі па барацьбе з бяспрытульнасьцю, куды прыводзяць гэтых дзяцей вуліцы і дзе зараджаецца плян перавыхаваньня іх з дапамогай працы. Удачны кадры ў майстэрнях, дзе працуюць беспрытульнікі, удала паказаны і энтузіязм, які паступова захапляе большасьць з іх пры будаўніцтве імі чыгункі. Яркі і цяжка забываемы тып былога бяспрытульнага-злодзея, які пад уплывам работы ў камуне ператвараецца ў сумленнага і сьвядомага рабочага, які ў канцы карціны гіне ад рукі шкодніка і сваёй сьмерцю папераджае крушэньне цягніка ідучага на пабудаванай рукамі бяспрытульных чыгунцы.

Толькі вось ня зусім зразумела, хто гэты самы шкоднік, які рыхтаваў крушэньне—былы бяспрытульны або правадыр злодзеяў? І затым, што, уласна, падштурхнула яго на арганізацыю крушэньня? Нянавісьць да камуны, жаданьне дыскрэдытаваць яе работу? Нібыта так. Але гэты момант у такім выпадку можна была-б паказаць значна яркэй. Па-мастацку тонка паказаны ў карціне мэтады перавыхаваньня зацкаваных жыцьцём вуліцы бяспрытульных. Даручэньне злодзею па прафэсіі купляць прадукты для камуны, адпраўка бяспрытульных у камуну без эвыклага для іх канвою і г. д.—усё гэта паказана па-мастацку праўдзіва і псыхалёгічна правільна.

Але ёсьць у гэтай наогул вельмі ўдалай карціне і недахопы. Нязясна для гледача як і калі беспрытульнік Колька (адна з галоўных дзейных асоб фільму) трапіў у працоўную камуну. Ня зусім зразумела, дзе адбываюцца п'янкі былых беспрытульнікаў: ці ў камуне, ці ў горадзе, ці ў суседняй з камунай вёсцы. Наўрад-ці таксама магчыма каб 3-4 чалавекі змаглі перавязаць масу (хоць і п'яных) беспрытульных, гуляўшых з сваімі «падругамі» ў нейкім прытоне. Усё гэта мсжа і дробязі, але гэтыя дробязі порашкаджаюць у некаторай ступені гледачу згрупаваць увагу на карціне. Тым больш, што гэтыя недахопы можна было-б лёгка зьнішчыць.

Але ёсьць ў карціне недахопы і больш сур'ёзныя. Камуна былых бяспрытульных паказана ў карціне неяк ізалявана, ня відаць не сувязі з грамадзкасьцю, з абкружаючым камуну савецкім сьветам. А ў гэтых адносінах можна было-б многае зрабіць. Ці-ж камуну не абкружаюць саўгасы, калгасы, нарэшце, проста савецкія вёскі? Як сялянства адносилася да былых бяспрытульных і цяпер сумленных рабочых? Які ўплыў аказалі хець-бы калгасы і саўгасы на перавыхаваньне былых дзяцей вуліцы? Усё гэта не знайшло адбітку ў карціне.

Не ў дастатковай ступені яркі паказаны ў карціне і ўдзел партыйнай арганізацыі, камсамолу ў рабоце на перавыхаваньні бяспрытульных. Праўда, камісія ЦВК—гэта ёсьць нарэшце партыйна - савецкая арганізацыя. Праўда, камсамол (у пачатку карціны) прымае досыць дзейны ўдзел у ліквідацыі бяспрытульнасьці. Але напершае, яго ўдзел выяўляецца хутчэй у міліцэйскіх абавязках (удзел у «аблаве» на бяспрытульных), а гэта, зразумела, далёка недастаткова.

Па-другое, амаль зусім не паказана работа партыі, работа камсамолу ўнутры самой камуны.

Вельмі добра, у дастатковай ступені разборліва перадаюцца ў гэтым гукавым фільму сьпевы беспрытульных то жаласьлівыя, то заліхвацка-ўдалыя. Што да дыялёгаў, дык тут ня ўсё зусім добра. Многае з дыялёгаў незразумела гледачу, яны часта зьліваюцца і заглушаюцца шумам перадаючай машыны.

Але паўтараем «Пуцёўка ў жыцьцё»—вялікае дасягненьне маладой савецкай гукавой кінематаграфіі. Гэта гукавая карціна бадрыць, дае здаровую зарадку энтузіязму і любоў да сацыялістычных формаў працы. Яна зусім варта таго вялікага посьпеху, якім яна карыстаецца на ўсіх экранах Савецкага Саюзу. Няма ніякага сумненьня, што гэтая карціна будзе вельмі цёпла сустрэнута і працоўнымі масамі за межамі нашай краіны.

Н. Б.

Р. С. Адміністрацыі «Чырвонай Зоркі» неабходна было-б напамятаць сваім біліцёрам, што ў іх абавязкі ўваходзіць ветліва паказваць гледачу яго месца. Білецёры «Чырвонай Зоркі» пры выкананьні сваіх абавязкаў бываюць часта надзвычайна грубыя.

АПАВЯШЧЭНЬНЕ

Нарада загадчыкаў ФЗС, іх нам., дзеловодаў і брыгадзіраў прадпрыемстваў адбудзецца 2-VIII гг. у 6 гадзін вечара ў Менгорінспэктуры Нарасьветы па пытаньнях падрыхтоўкі да новага навучальнага году.

Яўка абавязкова без спазьненьня.

Адказны рэдактар **П. ШАСТАКОЎ.**

ЦЫРК-КІНО-ТЭАТР

МЕНДЗЯРЖ-ТЭАТР — З 3 жніўня 1-я гастроль **муз. камэдыі** пад кіраўніцтвам Міраева „ХАЛОПКА" Папярэдні продаж білетаў у раб. касе з 12-2 і з 4-6 г. У касе тэатру з 12-2 і з 5-9 гадз. увеч.

Дзярж-ЦЫРК — СЁНЬНЯ 2 ВЯЛІКІХ ПАКАЗЫ УТРОМ пач. а 2 гадз. | ВЕЧАРАМ пач. а 8-45 х. Льготныя білеты ў рабкасе

Кіно-тэатр Культура — З 1-га жніўня мастацкі фільм „ЖОНКА" У гал. ролях Баталоў і Панова. Звыш праграмы канцэрт Белдзяржкіно Сьвятаславаньне

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" — Ад 2 жніўня зам. фільм „Пракурор Іордан" Пачатак а 7 гадзіне. Каса а 5 гадз.

КІНО „ПРАЛЕТАРЫ" — 2 сэрыі 18 част. у адзін сэанс Стэнлей у нетрах Афрыкі Пачатак а 2, 3-45, Вяч. а 7, 8-45 і 10-30 г.

„Чырвоная Зорка" — Першы гукавы мастацкі фільм Пуцёўка ў жыцьцё Драма ў 34 эпізодах

БЕЛАРУСКІ Дзяржаўны Вышэйшы Пэдагагічны Інстытут (рэарганізаваны з пэдфаку БДУ) абвяшчае АСЕНЬНІ НАБОР студэнтаў НА НАСТУПНЫЯ ФАКУЛЬТЭТЫ І АДДЗЯЛЕНЬНІ:

I. Сацыяльна-эканамічны факультэт:

а) Адз. Эканомікі 60 асоб, з іх белсэкцыя 30 асоб, яўсэкцыя 30 асоб. Аддзяленьне рыхтуе выкладчыкаў эканамічных дысцыплін у тэхнікумах, рабфаках і ФЗУ.

II. Літаратурна-лінгвістычны факультэт:

а) па аддзяленьне рэдакцыйна-выдавецкае, якое рыхтуе стыльрэдактараў для выдавецтваў і рэдакцый буйных газэт—прымаецца 30 асоб.

III. Пэдалёга-пэдагагічны факультэт:

а) на адз. пэдалёгічнае, якое рыхтуе выкладчыкаў пэдалёгіі і навуковых працаўнікоў для дасьледчых устаноў—прымаецца 30 асоб.

б) на інспэктарскае адз., якое рыхтуе інспэктароў Нарасьветы і кіраўнікоў буйных навучальных устаноў—прымаецца 30 асоб.

Заявы з дакумантамі вызначанымі ў даведчыку НКА, прымаюцца ў канцэляры Пэдінстытуту (Менск, Універсытэцкі Гарадок, прыродазнаўчы корпус) да 20 жніўня 1931 г. Іспыты для тых таварышоў, якія ня маюць сярэдняе асьветы, будуць праводзіцца 27, 28 і 29 жніўня. Аб тэрміну пачатку заняткаў будзе паведамлена асобна. Правілы прыёму абвешчаны ў даведчыку НКА аб паступленьні ў ВНУ.

Н стаўнікі прымаюцца толькі па прадстаўленьні дазволу ад раённых сэктароў Нарасьветы.

Стыпэндыямі і інтэрнатамі забясьпечваецца 70 проц студэнтаў.

Дырэктар Пэдінстытуту **В. РУДНІЦКІ**

Інстытут Асьпірантуры БАН абвяшчае, што ПРЫЁМ ЗАЯЎ У АСЬПІРАНТЫ на падрыхтоўчую групу спыняецца з 10 жніўня

3-га жніўня а 6-й гадзіне ўвечары ў Доме Комасьветы, пакой № 19 — АДБУДЗЕЦЦА — Менская гарадзкая нарада актыву Т-ва Пролетарскага турызму і экскурсій па пытаньнях:

1. Даклад Цэнтральнага Орг. Бюро аб задачах ТПТЭ.

2. Аб правядзеньні дэкадніка пролетарскага турызму.

Яўка старшынь і сэкратароў усіх ячэек ТПТЭ гор. Менску абавязкова і без спазьненьня.

Мен. Орг. Бюро ТПТЭ

КОШТ публікацыі аб згубе 1 дакуманту **1 р.**

ДАДАТКОВЫ ПЛЯН справаздачных сходаў Менгарсавету

№№ п. ч.	Прозьвішча дакладчыка	Дзе працуе і № тэлефону	№ куста	Назва прадпрыемстваў і ўстаноў, якія ўваходзяць у куст
1	Аксючыц Н. Л.	Галоўкамгас	1	Эльвод
2	Андрэеў І. Р.	Менбуд, тэл. 3-04	1	Групком і база майстэрань будканторы сумесна з утрыманцамі
			2	Групкомы 1—3—4, мясцком 1—2—3, Саюза грамадзкага харчаваньня сумесна з утрыманцамі
3	Ансдэін Я. Я.	Поньтэхнікум, тэл. 17-45	4	Гаоўдартранс сумесна з утрыманцамі
			5	Шч цяная фабрыка сумесна з утрыманцамі
4	Арлоў Я. С.	ДПУ, тэл. 53	6	Бэтонны завод сувязі
5	Беркоўскі	Гарсавет, тэл. 5-99	7	Друкарня імя Сталіна
			8	Арцель „Пралетары", „Новы Шлях", Крав. „Беларусь"
6	Берман А. Я.	Камітэт узаемадапамогі, тэл. 14-32	9	Групком скурнікаў сумесна з утрыманцамі
7	Бімбат У. Б.	Дзяржбуд, тэл. 7-72	10	Групком адзіночак будаўнікоў
8	Бергер В. А.	Друкарня імя Сталіна, тэл. 6-40	11	Абуткова фабрыка імя Гарсавету
9	Вялікаселец	Аддз. грам. харч., тэл. 16-19	12	МЦРК
10	Гарагляд	ЦСПСБ, тэл. 11-92	13	Шалерная фабрыка
			14	Скарняжная ф-ка імя 1-га Мая
11	Гольдберг С. Л.	Дзяржплян, тэл. 15-66	15	Дзяржплян
12	Гарбачоў	Камгас тэл., 15-84	16	Мясцком ШП-а
13	Грыцэль Д. М.	4-я дыстанцыя, тэл. 9-10	17	Цэнтральная пажарная часьць 2 і 3, пажарчасьці трубаатрад, КБК, АБВШ
			18	Групком Менбуду, рабочком пабудовы клінік
14	Дамброўскі К. Н.	ЦП машынабудаўніцтва (Мэталіст), тэл. 12-10	19	Ф-ка Беларуска
			20	Тэлефонная станцыя чугун. паштовае аддз. Белкіраўніцтва сувязі Мостроя БКС
15	Зарамбоўскі	ЦП саюзу працасьветаў, тэл. 12-02	21	Малочны завод і каўбасная фабрыка
16	Каранеўскі А. М.	Гарсавет	22	Завод імя Варашылава з утрыманцамі
17	Каменьтэйн	ЦСПСБ	23	Транспарт МЦРК
18	Карначоў А. М.	Гарком, тэл. 16-53, 1-30	24	Завод „Бальшавік"
19	Кеніг А. Ю.	Гар. КК, тэл. 2-67	25	Хлебзавод
20	Кумкес Н. З.	МЦРК, тэл. 104	26	Дэпо таварная
			27	Завод „Полымя Рэвалюцыі"
21	Дзічкоўскі А. Я.	Гарсавет	28	Арцель „Чырвоны Абутнік", „Чырвоны Лаячнік", „Новы Шлях", скургандаль, Уцільжыркосьць, „Чырвоны транспартнік"
22	Міруц	Фабрыка „Беларуска", тэл. 11-04	29	Групком машына-будаўніцтва з утрыманцамі
23	Млодзік І. М.	Міліцыя, тэл. 98	30	Рабочком пабудовы дому Ураду
24	Наўмёнак Я. Р.	Радыёцэнтр, тэл. 17-00	31	Групком мукамольнікаў
			32	Паштова-тэлеграфная кантора
25	Партны	Гарсавет, тэл. 8-64	33	Гараж Саюзтранса
26	Пінхасік	Камгас, тэл. 1-44	34	Ф-ка „Кастрычнік"
			35	Завод „Ударнік" сумесна з утрыманцамі
27	Плешакоў	ЦСПСБ, тэл. 17-58	36	Камунарка
			37	Працаўнікі міліцыі
28	Пазьняк	Эльвод, тэл. 12-08	38	Чыгуначнікі (за выключэньнем тавар. МББ)
29	Сафіян Я. М.	Галоўсацстрах, тэл. 12-08	39	Групком № 3-Будаўбазальня
			40	Скурна-галянтарэйная фабрыка
30	Скуратовіч	Гаоўкамгас тэл. 17-71	41	Мясцком Белбудабзяньня і Рабочком сантэхбуду
31	Гарасэвіч А. Л.	Аддзел грам. харч., тэл. 10-10	42	Заўком майстэрань Менбуду
32	Хонік	ГСПС, тэл. 6-00	43	Заўком майстэрань Будаўбазяньня
33	Шалькін Р. І.	ГСПС	44	З-д Камунар сумесна з утрыманцамі
34	Шэлкавец А. Л.	Гарсавет, тэл. 6-49	45	Завод Д. А.
			46	Ф-ка імя Крупскай, групком швэйнікаў, лябораторыя БПА
35	Якаўлеў	Пошта, тэл. 41	47	Заўком майстэрань Будаўбазяньня
36	Навасёлаў	Гарсавет АСО, тэл. 14-59	48	Абоз Саюзтранса

У сувязі з тым, што раней вызначаныя сходы часткова зрываліся, Менгарсаветам вызначаецца новы парадак правядзеньня справаздачных сходаў.

За правядзеньне сходаў уся адказнасьць усклядаецца на дакладчыкаў і фабзаўмясцкомы, якія між сабою ўзгадняюць час і месца (згодна пляну). Справаздачная кампанія павінна быць скончана не пазьней 12 жніўня.

Матар'ялы для дакладаў атрымаць у сэкратарыяце Гарсавету пакой № 8.

2-га жніўня а 7-й гадзіне ў Гарсавеце адбудзецца нарада ўсіх вышэйпералічаных дакладчыкаў. Далейшыя зьвесткі аб справаздачным пляне рабіцца ня будзе.

МЕНГАРСАВЕТ

ГАЛОЎДАРТРАНС БССР

даводзіць да ведама ўсіх зацікаўленых арганізацый, што

ЦУДАРТРАНСАМ І ДЗЯРЖПЛЯНАМ СССР —УСТАНОЎЛЕН—

наступны парадак падачы заявак на аўтамабілі, паступленьня 1932 г.

1. Усе гасорганы, установы і прадпрыемствы, якія маюць патрэбу ў аўтамабілях розных відаў і прызначэньня (легавыя, грузавыя, аўтобусы і спэцыяльныя), падаюць адпаведныя заяўкі ў Галоўдартранс БССР.

2. Паданыя заяўкі павінны быць абгрунтованы паведамленьнем наступных зьвестак: маркі, грузазварот і характарыстыка яго, прынятыя вымерніки работы аўтатранспарта, наліччa ў сучасны момант аўтамабіляў і інш.

ЗАЎВАГА: форму заявак атрымаць у Галоўдартрансе БССР (Сапецкая, 68).

3. Тэрмін падачы заявак—не пазьней 10 жніўня. Пасьля гэтага тэрміну заяўкі прымацца ня будуць.

4. Гасорганы, установы і прадпрыемствы саюзнага значэньня, забясьпечваемыя аўтамабілямі з цэнтралізаваных кантынгентаў, накіроўваюць другі экзэмпляр свае заяўкі на аўтамабілі ў свае саюзныя органы ў парадку падпарадкаванасьці.

ГАЛОЎДАРТРАНС БССР

Бабчынскі Пэдагагічны Тэхнікум

АБВЯШЧАЕ АСЕНЬНІ ПРЫЁМ на першы і другі курс

Усяго будзе прынята на 1 курс 80 чал., на 2 курс 20 чал.

Правілы прыёму згодна даведніка НКА на 1930-31 г.

Іспыты і залічэньні адбудуцца з 1-га па 15-га верасьня. Скончыўшыя 7-годку і ўсе іншыя адпавядаючыя 7-мігодцы ўстановы прымаюцца на 1-шы курс бяз іспытаў.

Заняткі з новым наборам пачнуцца 1-га кастрычніка.

60 проц. студэнтаў забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй.

Заявы з дакумантамі накіроўваць на адрасу: п-а Хойлікі, Бабчынскаму Белпэдтэхнікуму.

Дырэктар Тэхнікуму

БЕЛДЗЯРЖКІНО патрэбны статыстыкі на сталую работу

Могуць быць прыняты і асобы, якія яшчэ не працавалі ў гэтай галіне, але маюць адпаведную падрыхтоўку

Зварочвацца ў ПЭА ад 9 да 12 дня. Савецкая, 90, 2-і паверх

ПРЫЁМ ЗАЯЎ У МСЬЦІСЛАЎСКІ ПЭДТЭХНІКУМ і на аднагадовыя пры ім пэдагагічныя курсы працягваецца да 15 жніўня г. г.

Нам. дырэктара тэхн.

ЗГУБЛЕНЫ:

Вучотна-конская картка Цурко Ф. выдан Азарыцкім РВК.

Кніжка на каня, выдан. Чэрвенскім сталом на імя Белага В.

Вайсковая кніжка нарадж. 1891 г. на імя Чубенова Т.

Сяброўск: білет саюзу Працасьветы за № 2868 выдан. был. Калінскім акр. аддз. на імя Савініча В. М.

Вайсковы білет № 119151, выдан Азарыцкім РВК Дземяновіча М.

Мэтрычная выпіс аб нарадж. Пракшылава Ф. К.

Саюзная кніжка выдан. саюзам прац. зямлі і лесу № 52382 на імя Маньковай А. М.

Пасьведчаньне аб скончэньні Барысаўск. пэдтэхнікуму Левінай А. М.

Паявая кніжка № 3017 выдан. Дрыбінскім спажыв. т-вам на імя Бадрылазай А. М.

Саюзная кніжка саюзу Дрэвапрацоўшчыкаў выдан. Смаленскім Губ. аддз. за № 1685 на імя Папко І. І.

Паявая кніжка спажывецкага т-ва Малашэнкі В. Е.

Прафсаюзны білет асьветнікаў, выдан. Аршанскім саюзам Працасьветы Худалеева А. М.

Вайсковы білет Тэрчасьці Сокала М. П.

Вучотна-конская кніжка выдан. у 1929 г. Пухавіцкім РВК на імя Конаша К. І.

Глаўлітбел № 598

Друкарня імя СТАЛІНА